

# «МЭТА АДНА, ГЛАБАЛЬНАЯ, — НІКОМУ НЕ АДДАВАЦЬ СВОЙ РЫНАК ПА ЎСІХ НАПРАМКАХ»

**Перспектывы птушкагадоўлі і развіццё рэгіёна — гэтым пытанням была прысвечана камандзіроўка кіраўніка дзяржавы ў Салігорскі раён**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. СУБОТА № 192 (30580)

Фота Лізаветы ГОЛАД.



*Педагагічным работнікам Рэспублікі Беларусь*

***Дарагія сябры!***

Ад усёй душы віншую вас з Днём настаўніка.

Сёння, у эпоху імклівага інавацыйнага развіцця, роля настаўніка вялікая як ніколі. Ваша служэнне — гэта карпатлівая штодзённая праца, якая патрабуе не толькі бездакорнага валодання прадметам і методыкай яго выкладання, але і вялізнага цярпення, памнажанага на душэўную шчодрасць.

Дзякуючы вашаму прафесіяналізму і адказнаму падыходу да любімай справы моладзь вучыцца правільна і справядліва расстаўляць жыццёвыя прыярытэты, аналізаваць вялікія аб'ёмы інфармацыі і ацэньваць перспектывы сучаснага светапарадку, паспяхова прымяняючы атрыманыя веды і навыкі.

Вы аб'ядноўваеце сям'ю і школу для дасягнення агульных мэт — умацавання ў нашых дзяцей любові да Радзімы і фарміравання пачуцця дачынення да яе будучыні.

Удзячны ўсім работнікам сістэмы адукацыі за адданасць выбранаму шляху. Моцнага здароўя вам і вашым блізкім, шчасця і новых дасягненняў на карысць Беларусі.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# СЛУЖЭННЕ, ПАТРЭБНАЕ РАДЗІМЕ

ISSN 1990 — 763X

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

# «МЭТА АДНА, ГЛАБАЛЬНАЯ, — ПА ЎСІХ

## Перспектывы птушкагадоўлі і развіццё рэгіёна — якім пытанням была

Пятніцу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прысвяціў развіццю птушкагадоўлі. Гэтае пытанне кіраўнік дзяржавы разглядаў не ў кабінеце, а на Салігорскай птушкафабрыцы. І, па традыцыі прэзідэнцкіх камандзіровак, размова ішла не толькі пра адну галіну, а аб цэлым спектры пытанняў.



### МЕНШ ГАВАРЫЦЬ, А БОЛЬШ РАБІЦЬ

Першае пытанне — ход палявых работ. Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксей Кушнарэнка далажыў, што масавая сяўба азімых якраз завяршаецца. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый Горлаў паведаміў, што ўборку кукурузы на сілас плануецца скончыць да 20 кастрычніка, на зерне — максімум да 7 лістапада. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па сяўбе азімых не даводзіць нейкіх жорсткіх дат, але, маючы вопыт у аграрнай сферы, разумее, калі і што аптымальна зрабіць, каб ураджай будучага года быў не горшы за цяперашні. «Мужыкі, вы рабіце, калі хочаце. Я вам даты не прызначаў. Я адчуваю, калі трэба пасеяць. Восць да першага (кастрычніка. — **«Зв.»**) пасеялі — расліны сілу возьмуць, як у вёсцы кажуць. Яны сілу набяруць, перазімуюць. А калі мы пасеем пазней, ну, будзе парастак — не больш», — патлумачыў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы выказаў і крытычныя заўвагі да ўзроўню гаспадарання на зямлі. У прыватнасці, ён незадаволены якасцю ўзворвання ў асобных месцах. «Нават на падлёце — вы тут разаралі незразумела што. Але гэта не ўзворванне. Калі дрэнна ўзарана — не чакай ніякага ўраджаю. Таму што потым ужо бульдозерам будзеш раўняць поле», — сказаў Прэзідэнт.

У цэлым кіраўнік дзяржавы даў чыноўнікам публічную параду — менш гаварыць, а больш рабіць. Каб не стаць, як пісаў Маякоўскі, «прозаседавшимися».

### «АДЧУЖАЦЬ ЗЕМЛІ СЕЛЬГАСПРЫЗНАЧЭННЯ — НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ»

Яшчэ адно пытанне — закінутыя прысядзібныя ўчасткі па ўсёй краіне, якія цяпер не выкарыстоўваюцца. Прэзідэнт растлумачыў, што па сукупнай плошчы такія ўчасткі параўнальныя з землямі, якія ў краіне імкнуцца ўвесці ў абарот за кошт меліярацыі. Паводле яго слоў, гэтыя землі трэба ўводзіць у сельгасабарот і з імі разбірацца. Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў малых населеных пунктах ёсць шмат закінутых участкаў. «Каб усе разаралі, непатрэбнае прыбралі», — даручыў ён.

**Што датычыцца адчужэння зямель сельгаспрызначэння пад іншыя патрэбы, то Аляксандр Лукашэнка адназначна заявіў: «Гэта выключана. Гэта адзінкавыя выпадкі пад інвестыцыі нейкія. І то гэта ўсё рашэнні Прэзідэнта. Лес і сельгасугоддзі. Каб усе разумелі, што ў наступным годзе будзе поўная забарона на адчужэнне зямель сельгаспрызначэння. Адчужаць землі сельгаспрызначэння — ні ў якім разе».**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што цяперашнія землі сельскагаспадарчага прызначэння — гэта ў тым ліку спадчына, што дасталася ад продкаў, якія калісьці пачыналі асвойваць тэрыторыі. «Гэта багацце. Гэта не наш здабытак, або наш здабытак, але не мы гэта зрабілі, а нашы продкі», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

### ПРЫЙСЦІ ДА АГУЛЬНАГА ПАКАЗЧЫКА

Актуальная тэма — сельгастэхніка. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ўсім гаспадаркам патрэбна энерганасычаная тэхніка для работы, але далёка не ўсе гатовыя яе абслугоўваць і правільна эксплуатаваць, у выніку чаго яна вельмі хутка выходзіць са строю. «Нам трэба вельмі сур'ёзна думаць, каму даваць гэтую тэхніку», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Аптымальным варыянтам у такім выпадку бачыцца перадача тэхнікі туды, дзе яе дакладна змогуць абслужыць, але з абавязацельствам дапамагчы суседняй гаспадарцы. «Нельга аддаваць тэхніку абы-каму. Трэба ўзяць гэта на сур'ёзны кантроль», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Па словах Прэзідэнта, таксама варта прыйсці да агульнага паказчыка па тэрміне выкарыстання сельгаспадарчай тэхнікі. Напрыклад, 10 гадоў — трактар, 12-15 гадоў — камбайн, кормаўборачная тэхніка – 11-12 гадоў.

### НЕ ЗНІЖАЦЬ ПЛАНКУ

Асобную ўвагу кіраўнік дзяржавы звярнуў на ролю старшынь райвыканкамаў. Ён нагадаў пасыл, які агучвае кожнаму старшыні райвыканкама пры назначэнні. «Старшыня райвыканкама: у сваім раёне — гаспадар і прэзідэнт, які павінен кіраваць на сваёй тэрыторыі», — сказаў ён. Пытаць за вынікі ў іх неабходна больш строга, і сваю долю адказнасці яны павінны несці не толькі за прадпрыемствы камунальнай формы ўласнасці.

Абмеркавалі і ўраджай збожжавых гэтага года.







# НІКОМУ НЕ АДДАВАЦЬ СВОЙ РЫНАК КІРУНКАХ»

## прысвечана камандзіроўка кіраўніка дзяржавы ў Салігорскі раён

**«Добрае было надвор'е. Падчас наліву збожжа хапала вільгаці. Таму атрымалі цяжкавагавы колас. Гэта не значыць, што заўтра будзе так. Але гэта планка. Вось вы дасягнулі гэтага ўзроўню — ніжэй нельга. Трэба на гэтым узроўні замацавацца. Хоць бы пару гадоў. Нельга ніжэй апускацца», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Ён даручыў кіраўніцтву Мінскай вобласці літаральна алічбаваць адпаведныя заданні на ўзровень кіраўніцтва раёнаў.

### «ШАНЦ, ШТО ПАРОДА БУДЗЕ КАНКУРЭНТАЗДОЛЬНАЯ, ВЕЛЬМІ ВЫСОКІ»

Што датычыцца Салігорскай птушкафабрыкі, то на ёй вырабляюцца курыныя яйкі, яйкі перапёлак, пастаўляецца на рэалізацыю і мяса птушкі. На птушкафабрыцы рэалізаваны праект па будаўніцтве інавацыйнай перапёлкавай фермы замкнёнага цыкла з аўтаматызаваным зборам і пакаваннем яек. Для Беларусі гэты праект унікальны. Пасля выхаду перапёлкавай фермы на праектную магутнасць плануецца атрымліваць штогод не менш за 200 млн штук перапёлчыных яек, а аб'ём вытворчасці гэтага прадукту павялічыцца ў 1,8 раза.

На птушкафабрыцы ствараецца селекцыйна-генетычны цэнтр па гадоўлі перапёлак. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў спецыялістаў, калі будзе выведзена айчынная перапёлка. Пакуль айчынная птушкагадоўля залежыць ад паставак сутачнага маладняку прабацькоў і бацькоўскіх формаў з-за мяжы — гэта вельмі актуальнае пытанне. Спецыялісты закладваюць на гэта 3,5 года. «Хутка гэта не робіцца, пяць гадоў адводзіцца на атрыманне ўласнага кросу гібрыду парод і ліній хатняй птушкі. У нас ужо генафонд створаны. У нас ёсць база, ёсць з чым працаваць. Гэта рэальная работа», — сказала дырэктар Салігорскай птушкафабрыкі Іна Талкачова.

Прэзідэнт пацікавіўся меркаваннем на гэты конт кіраўніка Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра Караніка. «Па перапёлцы добры шанц ёсць. Шанц, што парода будзе канкурэнтаздольная, вельмі высокі», — адказаў ён.

Цалкам даклад аб дзейнасці Салігорскай птушкафабрыкі Аляксандр Лукашэнка заслухоўваць не стаў, адзначыўшы, што ў яго ёсць усе даведачныя матэрыялы. Ён задаў кіраўніку прадпрыемства канкрэтнае пытанне: «Ты мне скажы: грошы ў цябе ёсць?» Іна Талкачова адказала сцвярджальна. «Вось мне больш нічога не трэба. Грошы ёсць — малайчына», — адрэагаваў Прэзідэнт.

### «ТРЭБА НА ПЕРСПЕКТЫВУ, КАБ УСЁ БЫЛО СВАЁ»

Генетыку абмяркоўвалі не толькі на прыкладзе Салігорскай птушкафабрыкі. Генеральны дырэктар агракамбіната «Дзяржынскі» Уладзімір Лук'янаў далажыў аб рэалізацыі інвестыцыйнага праекта па стварэнні селекцыйна-генетычнага цэнтра птушкагадоўлі, але ўжо яйкавага кірунку. Аналагаў на постсавецкай прасторы яму няма. Айчынныя селекцыянеры ўжо ўшчыльную наблізіліся да найлепшых сусветных паказчыкаў па прадукцыйнасці курэй-нясушак. І гэта пры гэтым, што ідэальныя ўмовы яшчэ не створаныя — работа над гэтым яшчэ ідзе. «Мы ў 2029 — пачатку 2030 года створым прабацькоў», — расказаў Уладзімір Лук'янаў. Рэалізацыя гэтага праекта дасць магчымасць не толькі з лішкам задаволіць патрэбы Беларусі ў куранятах па яйкавым кірунку, але і наладзіць супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі. Праектам ужо цікавяцца ў Расіі і гатовыя заключаць кантракты.

У суседзяў ёсць цікавасць па сумеснай навуковай рабоце. У Беларусі маюцца напрацоўкі па яйкавым кірунку, у Расіі — па мясным. Аснова для ўзаемавыгаднай работы ёсць. «Трэба абменьвацца ў гэтым плане. Яйка — на мяса, груба кажучы. Ім выгадна гэта», — пагадзіўся Прэзідэнт. Але ў цэлым, заявіў кіраўнік дзяржавы, трэба працаваць, каб на перспектыву ўсё было сваё і па яйку, і па мясе.

Прэзідэнт асабіста азнаёміўся з тэхналогіямі ўтрымання прамысловага статка перапёлак, збору і ўпакоўкі перапёлчыных яек. Не абышлося і без дэгустацыі прадукцыі Салігорскай птушкафабрыкі.

Лічыцца, што па сваіх карысных якасцях перапёлчыны яйкі на трэць лепшыя, чым курыныя. Іна Талкачова адзначыла, што птушкафабрыка была б не супраць, каб іх больш закуплялі для школьнага харчавання, тым больш што вопыт ужо ёсць. «Трэба прапрацаваць з будучага года. А чаму не?» — падтрымаў ідэю кіраўнік дзяржавы. Прэзідэнт параіў і журналістам есці перапёлчыны яйкі.

Пасля гэтай камандзіроўкі гадаванцаў на прэзідэнцкай ферме пабольшае — кіраўніку дзяржавы падарылі перапёлак: двух «хлопчыкаў» і сем «дзяўчынак».

### НЕ АБ ПОСПЕХАХ, А АБ ПРАБЛЕМАХ І ТРЭНДАХ

Вытворчасць яек і мяса птушкі, праблемы і перспектывы галіны больш прадметна абмяркавалі на нарадзе з удзелам Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пры ўсіх недахопах Беларусь сёння — адзін з лідараў у рэгіёне па вытворчасці мяса птушкі і яек. Свае словы кіраўнік дзяржавы пацвердзіў фактамі: у 2024 годзе на душу насельніцтва выраблена 407 яек і рэалізавана ў забойнай вазе 63 кілаграмы мяса птушкі.

«Прадукцыя птушкагадоўлі заўсёды запатрабаваная і пры правільным кіраванні вельмі прыбытковая. За 2024 год рэнтабельнасць продажаў мяса птушкі склала 8,5 %, яек — блізка да 20 %. Па названых відах прадукцыі ў нас забяспечана харчовая бяспека. Вытворчасць мяса птушкі ад уласнай патрэбы складае амаль 160 %, яек — амаль 130 %», — прывёў лічбы Прэзідэнт. І падкрэсліў, што на нарадзе размова пойдзе не аб поспехах, а аб праблемах і аб трэндах у галіне. Кіраўнік дзяржавы пералічыў асноўныя пытанні.

**Першае. Узбуйненне прадпрыемстваў**

«Неабходны прадуманы падыход. Птушкай займаюцца 38 сельскагаспадарчых арганізацый: 20 — мяснога кірунку і 18 — яйкавага. У краіне вырошчваюцца бройлеры, качкі, індыкі, прадстаўлена вытворчасць курыных і перапёлчыных яек. Пашыраецца лінейка прадуктаў з мяса птушкі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым ільвіная доля вытворчасці мяса птушкі (75 % — тры чвэрці ад агульнай колькасці) прыпадае толькі на шэсць бройлерных птушкафабрык: «Дружба», Віцебская бройлерная птушкафабрыка, «Беларуснафта-Асобіна», Агракамбінат «Дзяржынскі», «Смалявічы-Бройлер», «Сервалюкс Агра», — пералічыў гэтыя прадпрыемствы Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што яны працуюць эфектыўна: выкарыстоўваюць сучасныя тэхналогіі, вырабляюць якасную прадукцыю, ажыццяўляюць яе глыбокую перапрацоўку, рэалізуюць у тым ліку на экспарт.

**«Ці здольныя астатнія птушкафабрыкі канкурыраваць з імі? Ці трэба нам такая канкурэнцыя? Што будзем рабіць далей: не будзем перашкаджаць ім развівацца, няхай, што называецца, самі па сабе, ці прымем іншыя нейкія рашэнні? Што будзем рабіць з гэтымі дробнымі прадпрыемствамі: ці будзем будаваць дробныя птушкафабрыкі або варта разгледзець пытанне іх рэарганізацыі шляхам далучэння да больш эфектыўных птушкафабрык? — абазначыў кола пытанняў кіраўнік дзяржавы. — Але пры гэтым прашу мець на ўвазе адно з асноўных пытанняў: там, дзе ёсць дробныя птушкафабрыкі, там ёсць пэўныя, калі не школа, то навыкі. Там людзі ўжо прыстасаваныя, яны ўмеюць нешта рабіць. Такіх людзей страціць нельга, таму што пабудаваць на пустым месцы птушкафабрыку — гэта не праблема сёння. Пытанне ў кадрах, у людзях. І не таму, што іх сёння не хапае ва ўсіх сферах. Патрэбныя адукаваныя, перакананыя птушкаводы».**

*(Працяг на 4-й стар.)*



# «МЭТА АДНА, ГЛАБАЛЬНАЯ, — НІКОМУ НЕ АДДАВАЦЬ СВОЙ РЫНАК ПА ЎСІХ КІРУНКАХ»

### Другое. Сітуацыя з падзяжом

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яна, на жаль, не паляпшаецца. Летась на вырошчванні і адкорме птушкі падзеж склаў 22 з паловай мільёны галоў. За студзень—жнівень 2025 г. — амаль 15 мільёнаў. У асобных абласцях назіраецца значны рост падзяжу: Гродзенская вобласць — 120 % да адпаведнага перыяду 2024 года, Мінская — 116 %, Віцебская — 115 %.

Пры гэтым пагалоўе павялічваецца нізкімі тэмпамі — у 2024 годзе ўсяго на 3 % да ўзроўню 2023 года.

> **«Тут павінны разумець, ці трэба нам павелічэнне пагалоўя. Гэта ж залежыць ад рынкаў збыту прадукцыі», — падкрэсліў Прэзідэнт.**

Ён звярнуў увагу, што прычыны падзяжу банальныя: незбалансаваная кармавая база, састарэлая інфраструктура, але часцей за ўсё безгаспадарлівасць і разгільдзяйства.

«Напрыклад, на птушкафабрыцы «Заходняя» Столінскага раёна дапускалася скормліванне птушцы пратэрмінаванага камбікорму, — прывёў прыклад кіраўнік дзяржавы. — Да гэтага часу выяўляюцца выпадкі парушэння рэжыму: пранос работнікамі асабістых рэчаў на тэрыторыю, праходжанне супрацоўнікаў у чыстую зону ў абыход санпрапускніка, а таксама праца без спецадзення. У некаторых птушкагадоўчых арганізацыях не выключана магчымасць траплення сінантропных (дзікіх. — **«Зв.»**) птушак. Не ў поўнай меры праводзяцца мерапрыемствы па барацьбе з грызунамі. Элементарнае не робім!»

Птушка не заўсёды вакцынуецца, а значыць, ёсць рызыка захворванняў, працягнуў Прэзідэнт. Устаноўлены факты адсутнасці на асобных аб'ектах неабходнай колькасці сродкаў дэзынфекцыі, медыкаментаў, невыканання схем лячэбна-прафілактычных мерапрыемстваў. «Вы разумееце, птушка ёсць птушка — істота вельмі далікатная і ад тэхналогій залежыць сур'ёзна», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы. Разам з тым дапускаюцца парушэнні тэхналагічных рэгламентаў і ветэрынарных правіл.

«Шмат у чым гэта абумоўлена кадравым дэфіцытам, паколькі птушкафабрыкі ўкамплектаваны ветэрынарнымі і заатэхнічнымі спецыялістамі на 90 %. Вось гэтыя размовы, што ў нас чагосьці не хапае, — гэтаму трэба пакласці канец. Падрыхтавалі спецыялістаў — яны павінны працаваць там, для чаго іх рыхтавалі. І гэту тэму трэба закрыць або шляхам забароны (што не вельмі добра), або тыя, хто бяруць сёння спецыяліста-аграрыя ў горад кудысьці працаваць на склад разносіць яйкі, а не вырабляць іх тут, няхай плацяць такія грошы, што гэта таксама будзе фактычна для іх забарона. Трэба вырашыць раз і назаўжды гэту праблему».

### Трэцяе. Далейшыя стратэгіі развіцця галіны

«Сёння мы ўбачылі інавацыйную перапёлкавую ферму. У агракамбінаце «Дзяржынскі» пабудаваны комплекс па вырошчванні мяса індычкі. Гэта новыя, «модныя» кірункі, карысныя і нават неабходныя для людзей, таму ёсць попыт на ўнутраным і знешнім рынках, — адзначыў Прэзідэнт. — Якой бачыце далейшую стратэгію развіцця галіны, якія новыя кірункі ў птушкагадоўлі мы яшчэ можам развіваць або будзем паглыбляць існуючыя?»

### Чацвёртае. Экспарт мяса птушкі

Летась ён склаў амаль паўмільярда долараў — экспартавалі амаль 250 тысяч тон мяса птушкі, 835 мільёнаў штук курыных яек.

> **«Краіна ўваходзіць у топ-15 вядучых сусветных экспарцёраў мяса птушкі і яек. Асноўныя нашы контрагенты — гэта Расія, Кітай і краіны Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Аднак Расія забяспечвае сябе і мясам птушкі, і яйкамі. Кітай таксама паказвае высокія тэмпы росту вытворчасці, — прывёў факты Аляксандр Лукашэнка. — Пытанне новых рынкаў. Дзе яны?»**

### Пятае. Зніжэнне залежнасці галіны ад імпарту

«У краіне няма альтэрнатывы імпарту курацянят для вытворчасці інкубацыйных яек. Для камплектавання птушкафабрык прабацькоўскі статак мясных куранят мы завозім, таксама і ў яйкавай птушкагадоўлі. Кожная птушкафабрыка працуе напрамую з замежнымі партнёрамі, — пазначыў праблему кіраўнік дзяржавы. — Поўная залежнасць ад імпарту не гарантуе стабільную работу птушкафабрык. Кожны завоз птушкі звязаны ў тым ліку з верагоднасцю заносу новых інфекцый, а таксама, што вельмі актуальна, са зрывам паставак».

Прэзідэнт пацікавіўся, як будзе вырашацца пытанне няхваткі магутнасцяў бацькоўскіх пляцовак у яйкавым і мясным кірунках. Ён нагадаў, што яшчэ ў 2023 годзе даручаў стварыць селекцыйна-генетычны цэнтр для атрымання ўласнай племяннoй прадукцыі. Уяўлялася, што гэта будзе ўнікальнае для Беларусі прадпрыемства поўнага цыклу. «Але не ведаю, ні хісткa ні валка там ідуць справы. Усяго тры працэнты там пабудавана», — заўважыў беларускі лідар і паставіў задачу: хутчэй увесці гэта прадпрыемства.

### Шостае. Навука

Прэзідэнт пацікавіўся: куды мы рухаемся ў гэтым кірунку? «Мясная птушкагадоўля ў нас пакуль залежыць ад імпарту ў частцы зыходных ліній (прабацькоўскага пагалоўя), але я ведаю, што ў яйкавай птушкагадоўлі актыўна вядзецца работа па атрыманні айчынных кросаў курэй. Нашы навуковыя напрацоўкі ў селекцыі павінны даць новы імпульс развіццю эфектыўнай вытворчасці. Пры гэтым нельга пакідаць без увагі ўсе віды птушкі», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

## «СВОЙ РЫНАК НЕ ТРЭБА НІКОМУ АДДАВАЦЬ»

Рэзюмуючы пазначаныя для абмеркавання пытанні, Аляксандр Лукашэнка зрабіў акцэнт, што пасля гэтай нарады павінен быць канкрэтны імпульс для развіцця таго ці іншага кірунку. І папярэдзіў: усё, пра што дамовіліся, павінна быць жалезна выканана.

> **«Свой рынак не трэба нікому аддаваць. Зоймем рынак — і добра. Дапамагайце там, дзе магчыма, сваім прадпрыемствам. Гэта вельмі важна цяпер. Мэта адна, глабальная — нікому не аддаваць свой рынак па ўсіх кірунках, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Калі ёсць рынак, калі мы бачым добрую эканоміку ў той ці іншай вытворчасці, трэба падтрымліваць гэтыя праекты, а не траціць грошы незразумела куды».**

## МОЖАМ ЗАХАВАЦЬ У КРАІНЕ ПАЎТАРА МІЛЬЁНА ЕЎРА

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Юрый Горлаў далажыў, што ў Беларусі мяса птушкі займае долю ў 38 % ад усёй вытворчасці мяса ў краіне. Што датычыцца мясной птушкагадоўлі, то прабацькоўския формы закупляюцца за граніцай і пастаўляюцца на племптушкарэпрадуктар «Бройлер» агракамбіната «Дзяржынскі». «Там мы выраблеем 2 млн галоў бацькоўскага статка. Гэта 56 % ад усяго бацькоўскага статка, які нам патрабуецца ў краіне», — расказаў міністр. Астатнія 44 % бацькоўскага статка пакуль закупляюцца за граніцай, хоць гэтыя паўтара мільёна галоў можна было б атрымліваць у Беларусі. Для гэтага трэба дабудаваць яшчэ адзін рэпрадуктар першага парадку. «Ён будзе невялікім. Там літаральна два будынкі, каб цалкам 3,5 млн галоў бацькоўскага статка выраблять у сябе ў краіне. Сёння кошт аднаго кураняці, якога мы атрымліваем у сябе, — 5,2 еўра. За граніцай мы купляем за 6,2 еўра. На адным кураняці мы пераплачваем 1 еўра. На паўтара мільёна галоў — гэта паўтара мільёна еўра, якія могуць заставацца ў краіне», — адзначыў Юрый Горлаў.

Для рэалізацыі праекта па будаўніцтве рэпрадуктара разам з абсталяваннем спатрэбіцца каля 20 мільёнаў рублёў. «Сем мільёнаў долараў па максімуме. А то і ў пяць укладзёмся», — зрабіў выснову кіраўнік дзяржавы.

«Нам гэта трэба заўтра ці мы негатовыя, яго пабудаваўшы, эксплуатаваць? Калі яно будзе заўтра, вы яго можаце выкарыстоўваць? Фабрыкам гэта трэба?» — пацікавіўся Аляксандр Лукашэнка. Міністр адказаў сцвярджальна. Больш за тое, паводле яго слоў, гэта гарантуе не толькі сыход ад залежнасці па імпарце, але і забяспечыць прафілактыку і мінімізацыю хвароб.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота БелТА.**



ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ЗРАЗУМЕЛА, ДАСТУПНА І СПРАВЯДЛІВА

## Дэпутаты прынялі важныя заканадаўчыя рашэнні



Фота БелТА.

Яны датычацца ўрэгулявання зямельных адносін, удасканалення Падатковага кодэкса і заканадаўства аб адміністрацыйных правапарушэннях, дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, міжнароднага супрацоўніцтва ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза.

## ЗЯМЕЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ З САЦЫЯЛЬНЫМ КАНТЭКСТАМ

Прыняцце ў першым чытанні законапраекта «Аб змяненні законаў па пытаннях рэгулявання зямельных адносін» — чарговы этап сістэмнай работы па павышэнні эфектыўнасці заканадаўства аб ахове і выкарыстанні зямель. **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** нагадаў, што новая рэдакцыя Кодэкса аб зямлі, якая аблягчыла рашэнне многіх пытанняў землекарыстання, дзейнічае з 1 студзеня 2023 года. «Аднак непрацяглы перыяд практыкі яго прымянення, аналіз зваротаў грамадзян выявілі шэраг палажэнняў, якія патрабуюць далейшай карэкціроўкі і ўдакладненняў, — адзначыў ён. — За 8 месяцаў бягучага года нам паступіла 229 зваротаў па пытаннях землекарыстання: гэта амаль 5 % ад усіх зваротаў».

Спікер звярнуў увагу на тое, што ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў дакумент, які датычыцца рэгулявання зямельных адносін, павінен быў уносіцца ў Палату прадстаўнікоў у лютым 2026 года. Аднак дзякуючы сістэмнай рабоце Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, іншых зацікаўленых ведамстваў законапраект паступіў у Палату прадстаўнікоў з істотным апераджэннем графіка.

«Законапраект быў адпрацаваны па новай методыцы, — праінфармаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Іван МАРКЕВІЧ**. — Дэпутаты разам з распрацоўшчыкамі дэталёва вывучылі і істотна прааналізавалі тыя артыкулы заканадаўства, якія падвергліся змяненню. Праведзена больш за 30 нарад, на якіх дэпутаты агучвалі просьбы выбаршчыкаў. Мы гэта ўсё ўлічылі».

У прыватнасці, райвыканкамы надзяляюцца больш шырокімі паўнамоцтвамі ў сферы адабрання і прадастаўлення зямельных участкаў для дзяржаўных патрэб. Грамадзянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, але добраахвотна адмовіліся ад раней выдзеленага ім зямельнага ўчастка, пры наяўнасці ўважлівых прычын паўторна прадастаўляецца зямельны ўчастак для будаўніцтва жылога дома. Замацоўваюцца адобраныя раней кіраўніком дзяржавы падыходы па легалізацыі самавольнага заняцця зямель, пашырэнне падстаў для такой легалізацыі.

## ПАДАТАК АД РЭАЛІЗАЦЫІ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫІ І ПАВЕЛІЧЭННЕ ТРАНЗІТНЫХ ПАТОКАЎ

Уносяцца змяненні і ў Падатковы кодэкс. Як адзначыла **член Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Наталля КУЛЯШОВА**, новаўвядзенні датычацца выключна фізічных асоб і даходаў, атрыманых імі ад рэалізацыі прадукцыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, вырашчанай на асабістым падсобным участку як самой фізічнай асобы — уласніка зямельнага ўчастка, так і яго сваякоў, апекуноў.

«З прыняццем змяненняў даход будзе вызначацца з фактычна атрыманага даходу ў каляндарным годзе, — патлумачыла дэпутат. — Другое змяненне датычыцца асаблівасцяў падаткаабкладання або вызвалення даходу ад рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі, якая заяўляецца фізічнымі асобамі ў тлумачэннях аб крыніцах грашовых сродкаў пры дэклараванні даходаў і маёмасці».

## ФЕЕРВЕРКІ — ПАД ЖОРСТКІМ КАНТРОЛЕМ

У другім чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях». Удакладняюцца паўнамоцтвы Прэзідэнта і ўрада ў галіне гарантавання пажарнай бяспекі. Замацоўваюцца паўнамоцтвы па ажыццяўленні дзяржаўнага пажарнага нагляду на аб'ектах па вытворчасці, захоўванні і ўтылізацыі выбуховых матэрыялаў і вырабаў, якія іх змяшчаюць, па арганізацыі тушэння пажараў, якія ўзнікаюць на такіх аб'ектах. З крыніц фінансавання органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях выключаюцца абласныя бюджэты і бюджэт горада Мінска.

«Гэта павысіць эфектыўнасць выкарыстання грашовых сродкаў, аднак мясцовыя органы кіравання і самакіравання не пазбаўлены права выкарыстоўваць свае бюджэты з мэтай удасканалення супрацьпажарнай бяспекі, развіцця інфраструктуры», — удакладніў **член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Анатоль БУЛАЎКА**.

Супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях надзяляюцца правам правядзення асабістага нагляду грамадзян і прымянення спецыяльных сродкаў у выпадках і парадку, вызначаных законапраектам. Як патлумачыў дэпутат, устанаўліваецца свайго роду заслона ад нядобрасумленных пастаўшчыкоў і прадаўцоў выбухованебяспечнай прадукцыі. «Ні адзін Новы год не праходзіў без апаленых рук, твараў, пажараў у кватэрах з-за кантрафактных гірлянд і феерверкаў», — прывёў прыклад важнасці навацыі парламентарый.

## ДА ПРАВАПАРУШАЛЬНІКАЎ — З ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ ПАДЫХОДАМ

Праектам Закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці», адобраным у першым чытанні, павышаецца аператыўнасць вядзення па справах аб адміністрацыйных правапарушэннях, забеспячэнне прымянення прафілактычных і выхаваўчых мер уздзеяння. Ліквідуюцца прабелы ў адміністрацыйна-прававым рэгуляванні з улікам бягучых эканамічных, сацыяльных і палітычных працэсаў, пераважна ў інтарэсах забеспячэння нацыянальнай бяспекі Беларусі.

У якасці прыкладу **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Аляксандр АМЕЛЬЯНЮК** прывёў правапарушэнні, звязаныя з невыкананнем Правілаў дарожнага руху. «Сёння ўстаноўлена адміністрацыйная адказнасць асобы, якая кіруе транспартным сродкам і якая не мае такога права, — канкрэтызаваў дэпутат. — Пад гэту катэгорыю трапляюць асобы, якія ніколі не атрымлівалі такога права, якія пазбаўлены кіравання транспартным сродкам за пэўныя правапарушэнні, у якіх скончыўся тэрмін вадзіцельскага пасведчання. Натуральна, гэта розныя людзі, розныя правапарушэнні — адпаведна, і адказнасць павінна адрознівацца. Мы размяжоўваем гэтыя катэгорыі. Тых, хто па пэўных прычынах не працягнуў тэрмін дзеяння вадзіцельскага пасведчання, чакае больш мяккае адміністрацыйнае пакаранне, чым асоб, якія трапляюць пад іншыя катэгорыі».

**Вераніка КАНЮТА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Открытое акционерное общество
**«Дорожно-строительный трест № 3»**
**22 октября 2025 года в 11.00**
проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества

| № п/п | Сведения о предмете аукциона | Начальная цена продажи со снижением на 40 % без НДС, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| лот № 1 | Автомобиль GEELY EMGRAND GT, тип ТС – легковой седан (sedan), год выпуска 2017, регистрационный знак 0725 IB-6, кузов (рама) № Y4K9944ZXHB000166, цвет ТС – черный, инвентарный № 3329 | 19 920,00 | 1 992,00 |
| лот № 3 | Экскаватор JCB JS220SC, год выпуска 2011, регистрационный знак ТК-6 1689, заводской номер JSBJS22DK01460883, инвентарный номер № 874 | 69 600,00 | 6 960,00 |

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его местонахождение и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 802220712424.
2. Дата, время и место проведения аукциона: **22 октября 2025 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.
3. Порядок, в соответствии с которым проводится аукцион: Положение о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества, находящегося в собственности ОАО «ДСТ № 3» (утвержденное приказом генерального директора № 5 от 03.01.2022).
4. Участник аукциона за 3 рабочих дня до проведения аукциона должен подать заявление на участие в аукционе, подписать с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607
5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: 212022, г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **16.10.2025 г., время: 17.00.**
6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.
7. Сроки подписания договора купли-продажи: договор купли-продажи имущества должен быть подписан победителем аукциона (претендентом на покупку) в редакции организатора аукциона после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и предоставления организатору аукциона копий платежных документов, но не позднее 5 рабочих дней.
8. Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола.
9. Извещение о проведении предыдущего аукциона по продаже имущества ОАО «ДСТ № 3» размещено в газете «Звязда» 28.08.2025 и на сайте ОАО «ДСТ № 3»



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов, Оператор электронной торговой площадки) извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего **ООО «Империал аренда»** (Продавец).

**Электронные торги состоятся 19.11.2025.**

**Лот № 1**
Здание временное сборно-разборное (павильон) в размерах 24,00x44,00x5,4=1056 м², расположенное на части открытой площадки.
**Начальная цена без НДС –** 1 267 200,00 руб.
**Задаток –** 126 720,00 руб.

**Лот № 2**
Здание временное сборно-разборное (павильон) в размерах 9,00x48,00x6,0=432 м², расположенное на части открытой площадки.
**Начальная цена без НДС –** 518 400,00 руб.
**Задаток –** 51 840,00 руб.

Обременения: аренда.
**Местонахождение Лотов №№ 1-2:**
г. Минск, ул. Петруся Бровки, 30.
**Шаг электронных торгов** – 5 %.

Порядок проведения электронных торгов определен Регламентом электронной торговой площадки «GOSTORG» (далее – ЭТП).

Детальная информация об электронных торгах, в том числе об оформлении участия в них, условиях торгов размещена на ЭТП.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами и задатков: **17.11.2025 в 16.00.**

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52, torgi@ino.by**
**Электронный адрес ЭТП: gostorg.by**

УНП 190055182



ИНФОРМАЦИЯ О ПРЯМОЙ ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ДОМА

*В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24.03.2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**ПРОДАЕТСЯ**

**одноэтажный бревенчатый одноквартирный жилой дом общей площадью жилых помещений 55 м² без хозяйственных построек, расположенный по адресу: аг. Лешница, ул. Школьная, д. 71, Березинского района Минской области на земельном участке 0,2 га.**

Цена пустующего жилого дома: одна базовая величина 42,00 (сорок два) белорусских рубля 00 копеек и дополнительно компенсация расходов, связанных с продажей дома.

С дополнительной информацией можно ознакомиться в извещении о продаже пустующего дома на официальном сайте Березинского районного исполнительного комитета (berezino.minsk-region.gov.by).

**Тел. 801715 64325.**

УНП 600092490

Статусбанк

ОАО «СтатусБанк»
www.stbank.by

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## 30 сентября 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 90 369 | 89 158 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 40 873 | 25 691 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 119 057 | 119 412 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | - | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 133 357 | 119 407 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 087 | 8 231 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 495 | 4 005 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 393 238 | 365 904 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 6 379 | 3 027 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 286 243 | 265 074 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 3 082 | 3 836 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 295 704 | 271 937 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 50 765 | 48 000 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 14 885 | 14 885 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 140 | 142 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 31 744 | 30 940 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 97 534 | 93 967 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 393 238 | 365 904 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## за 3 квартал 2025 года

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 2025 год | 2024 год |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 29 825 | 22 267 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 19 794 | 9 323 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 10 031 | 12 944 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 9 080 | 5 581 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 722 | 3 746 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 4 358 | 1 835 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | - | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 39 667 | 39 109 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 2 598 | 1 361 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 523 | 684 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 24 321 | 19 888 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 1 167 | 790 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 26 493 | 32 533 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 5 750 | 7 565 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 20 743 | 24 968 |

И.О. Председателя Правления

Главный бухгалтер

Дата подписания: 01 октября 2025 г.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 26 выдана Национальным банком Республики Беларусь 29.05.2025 г. УНП 807000043*


# ГОНАР КРАІНЫ

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА павіншаваў удзельнікаў і гасцей абласных фестываляў-кірмашоў «Дажынкі-2025» Брэсцкай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей

**У звароце да хлебаробаў Брэстчыны** зазначаецца: «Брэсцкая вобласць па праве лічыцца адным з самых развітых аграрных рэгіёнаў краіны. Тут жывуць людзі, якія не толькі беражліва захоўваюць найлепшыя традыцыі айчыннага земляробства, але і смела ўкараняюць сучасныя тэхналогіі, паказваючы прыклад высокай культуры вытворчасці і моцнай працоўнай дысцыпліны.

Настойлівасць, адказнасць, граматная арганізацыя ўсіх працэсаў дазволілі вам дасягнуць выдатных вынікаў, павялічыўшы леташнія паказчыкі як па ўраджайнасці, так і па намалоце. Дзякуючы каманднаму духу і згуртаванасці палова вашых раёнаў пераадолела статысячную мяжу».

**У віншаванні аграрыяў Віцебскай вобласці** асаблівыя словы ўдзячнасці Прэзідэнт адрасаваў аграрыям Аршанскага і Віцебскага раёнаў, якія перавысілі статысячную мяжу па намалотах.

«У гэтым годзе надвор'е правярала Віцебшчыну на трываласць. Падчас гарачай пары вашы палі залівалі дажджы. Гэта ўскладняла выхад тэхнікі на ўборку. Для нарошчвання тэмпаў жніва ў вобласць былі накіраваны зводныя атрады з трох суседніх рэгіёнаў краіны, таксама сваё плячо падставілі вайскоўцы і супрацоўнікі МНС.

Усе разам вы змаглі сабраць годны ўраджай — каравай вобласці дасягнуў 1 мільёна тон, што пацвярджае прафесіяналізм, адказнасць і выкананне тэхналогій», — гаворыцца ў віншаванні.



Фота БелТА.

**У прывітальным адрасе працаўнікам Магілёўскай вобласці** падкрэсліваецца, што, нягледзячы на асаблівыя прыродна-кліматычныя фактары, Прыдняпроўе можа ганарыцца атрыманымі ў бягучым годзе вынікамі і прагназаваць іх павышэнне ў найбліжэйшай будучыні.

«Дзякуючы дакладнай арганізацыі працы і адказным адносінам да ўсіх тэхналагічных працэсаў працаўнікі Магілёўскай вобласці пераадолелі знакавую мяжу ў мільён тон збожжавых, зернебабовых культур, кукурузы і рапсу. Гэта дазволіла зрабіць значны ўнёсак у агульнарэспубліканскі каравай, а значыць, і ў харчовую бяспеку краіны», — сказана ў прывітанні.

**Таксама Прэзідэнт пажадаў хлебаробам і іх сем'ям моцнага здароўя, шчасця, дабрабыту і новых поспехаў у нялёгкай, але такой важнай працы.**

З НАГОДЫ

# ГАЛОЎНЫ АРЫЕНЦІР — ЛЮДЗІ ПРАЦЫ

## Федэрацыя прафсаюзаў адзначае сваё 35-годдзе



Фінальным акордам святкавання адметнай даты стаў урачысты сход, які сабраў у Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў больш за 500 чалавек. Галоўным арыенцірам у рабоце самага буйнога грамадскага аб'яднання краіны на працягу ўсіх дзесяцігоддзяў былі людзі працы, а асноўнымі прынцыпамі — справядлівасць, давер, адзінства і салідарнасць.



Федэрацыя прафсаюзаў прайшла няпросты шлях разам са станаўленнем нашай суверэннай дзяржавы. Пра гэта нагадаў **першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

— Краінай пад кіраўніцтвам Прэзідэнта быў пройдзены вялікі шлях — ад няпростых 1990-х пасля развалу Савецкага Саюза, калі ніхто не разумеў, што рабіць і што будзе, да сённяшняга дня. У перыяд, калі эканоміка суверэннай дзяржавы яшчэ не была пабудавана, больш за ўсё ад тых узрушэнняў пакутаваў просты чалавек працы. Чалавек, на абарону якога, акрамя прафсаюзаў і кіраўніка дзяржавы, ніхто не мог стаць, бо ніхто не разумеў, што будзе. Былі парушаныя эканамічныя сувязі, узніклі чахарда з валютай, гіперінфляцыя, калі за зарплату просты працоўны чалавек мог купіць сабе палову праязнога. Але ўжо тады была выбудавана тая сістэма, якая сёння з'яўляецца асновай справядлівых узаемаадносін дзяржавы, прафсаюзаў і чалавека працы, — адзначыў Уладзімір Пярцоў. Ён падкрэсліў, што Федэрацыя прафсаюзаў заўсёды прытрымліваецца інтарэсаў нашай краіны.



**Старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Юрый СЯНЬКО** адзначыў, што асноўнымі задачамі грамадскага аб'яднання сёння з'яўляюцца дабрабыт чалавека працы, дастойная зарплата і стабільная работа прадпрыемстваў, абароненасць і ўпэўненасць у сённяшнім і заўтрашнім днях.

— 5 кастрычніка 1990 года ўсе галіновыя прафсаюзы прыйшлі да адзінага меркавання: трэба згуртаваць намаганні. Была створана Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, аб'яднанне, якое гэтыя 35 гадоў збірала найлепшыя традыцыі. І, вядома ж, гэтыя традыцыі аб'ядноўваліся і ўвасабляліся ў жыцці ва ўсіх калектывах краіны. Мы пастаянна ўдасканальваем гэту работу. Абсалютна ўсе нашы галіновыя прафсаюзы разумеюць агульную задачу. Федэрацыя прафсаюзаў праз калектыўныя дагаворы, рашэнні, якія праводзяцца праз нас, разбірае канкрэтныя пытанні. І тут у нас поўнае паразуменне паміж урадам, прафсаюзамі і наймальнікамі. Мы ганарымся гэтым дасягненнем. Яно стала магчымым у першую чаргу дзякуючы падпісанаму ў 1995 годзе ўказу Прэзідэнта, які даў штуршок сацыяльнаму партнёрству, — перакананы Юрый Сянько.



**Старшыня Беларускай партыі «Белая Русь» Вольга ЧАМАДАНАВА** адзначыла, што вырасла не адно пакаленне людзей, якія давяраюць прафсаюзам.

— Усе члены прафсаюзных аб'яднанняў — гэта людзі працы. І быць абароненым у працоўных адносінах — вельмі важны момант. Сёння па лініі супрацоўніцтва палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў нам трэба абмяркоўваць і вырашаць шэраг праблемных пытанняў на карысць нашага грамадства.

**Алена КРАВЕЦ.**

# АГРААЛІМП НА ГОМЕЛЬСКІ ЛАД

**На Гомельшчыне ў гарадскім пасёлку Лельчыцы фестываль-кірмаш «Дажынкі-2025» сабраў найлепшых аграрыяў паўднёва-ўсходняга рэгіёна**

Яркая кульмінацыя жніва — свята ўраджаю і павагі да працы земляробаў у Лельчыцах супала з адкрыццём у гарпасёлку дзясяткаў новых і рэканструяваных аб'ектаў, якія доўгія гады будуць нагадваць аб гонары быць у шэрагу сталіц «Дажынак».

## ЧАС ВЫНІКАЎ І СТАРТУ ДА НОВЫХ ЗДАБЫТКАЎ

Прывітальны адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі задаў асноўны тон ураджайнаму фестывалю «Дажынкі – 2025» у Лельчыцах. З галоўнай сцэны яго зачытаў **кіраўнік спраў Прэзідэнта, упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта ў Гомельскай вобласці Юрый НАЗАРАЎ**. У звароце беларускі лідар высока адзначыў самаадданую працу аграрыяў Гомельшчыны. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гомельская зямля штогод уносіць значны ўклад у хлебны каравай краіны. «Вось і ў бягучым годзе, нягледзячы на ранняю пасяўную кампанію і дажджлівае лета, палі ўбраны, свірны загружаны, перапрацоўчыя прадпрыемствы забяспечаны сыравінай. Гэта галоўная ацэнка работы аграпрамысловага комплексу вобласці, лепшая ўзнагарода за вашы намаганні», — адзначыў у прывітальным адрасе Аляксандр Лукашэнка.



Кіраўнік спраў Прэзідэнта асабліва падкрэсліў стратэгічнае значэнне для нашай краіны аграрнага сектара: «Беларусь цалкам забяспечыла сябе ўласнымі прадуктамі. Не кожная дзяржава можа гэтым пахваліцца. Мы абавязаныя гэтым ганарыцца. І людзям, якія гэта зрабілі, павінны заўсёды гаварыць «вялікі дзякуй»». Юрый Назараў таксама адзначыў важнасць захавання такой важнай традыцыі, бо правядзенне «Дажынак» у райцэнтрах — сапраўды знакавая падзея, якая надае гарадскім пасёлкам «зусім іншае гучанне».

Далейшых поспехаў, развіцця і руху толькі наперад, да перадавых пазіцый у рэспубліцы аграрыям Гомельшчыны пажадаў **намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль СІВАК**. Ён уручыў на галоўнай фестывальнай сцэне заслужаныя ўзнагароды хлебаробам за іх шматгадовую добрасумленную працу, значны ўклад у развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці.

## НОВЫЯ АБ'ЕКТЫ — ПАДАРУНКІ

Да галоўнага свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі – 2025» Лельчыцы падышлі сапраўды абноўленымі. За год у райцэнтры рэалізавалі больш за 180 праектаў па рамонце і будаўніцтве. Адзін з самых значных — пуск у эксплуатацыю цэнтральнай кацельні на мясцовых відах паліва, якая не толькі дае істотную эканомію, але і робіць энергетыку раёна больш устойлівай і незалежнай. Яшчэ адной важнай падзеяй стала адкрыццё пасля капітальнай рэканструкцыі хірургічнага аддзялення Лельчыцкай райбальніцы. Сацыяльная сфера Лельчыц таксама атрымала свой падарунак. Пасля поўнага рамонту адкрыўся абноўлены ТЦСАН. Істотнае абнаўленне закранула і транспартную сетку гарпасёлка. На вуліцы Чырвонаармейскай адкрылі мост пасля капітальнага рамонту. Абнавілі ў гарпасёлку і мясцовую аўтастанцыю: у будынку правялі поўную рэканструкцыю, замянілі ўсе інжынерныя сеткі і адрамантавалі залы чакання.

Асаблівым падарункам да свята, якое ўпершыню прымаюць Лельчыцы, стаў новы шматкватэрны дом. Дарэчы, ключы ад яго кватэр атрымалі ў тым ліку спецыялісты, для якіх уласнае жыллё — асаблівая форма падтрымкі для замацавання ў раёне.

Вельмі яркай і кранальнай падзеяй для Лельчыц з нагоды «Дажынак» стала першае вяселле ў абноўленым аддзеле запісу актаў грамадзянскага стану. Таццяна Фіцнер і Даніїл Чыжык зарэгістравалі шлюб менавіта ў дзень свята.

## ЭНЕРГІЯ, МАЙСТЭРСТВА І АДДАНАСЦЬ СПРАВЕ

Традыцыйна вельмі яркай часткай абласнога фестывалю стала шэсце дэлегацый аграрыяў усіх раёнаў Гомельшчыны. **Старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО** падзякаваў працаўнікам вёскі вобласці за той вынік , які, нягледзячы на сур'ёзныя выклікі, удалося сёлета паказаць: «Сёння мы ўшаноўваем чалавека працы — таго, хто са збожжа стварае хлеб, а з клопату аб зямлі — будучыню Гомельшчыны. Наша шчырая падзяка камбайнерам, кіроўцам, аператарам зернесушыльных комплексаў, усім працаўнікам палёў і млынкамбінатаў. Усім, хто ўдзельнічаў ва ўборачнай кампаніі. Няхай ваша энергія, майстэрства і адданасць справе вядуць нас да новых рэкордаў, да новых ураджаяў і да працвітання нашай роднай Гомельскай вобласці і любімай Беларусі».



Чэмпіёнамі па вытворчасці збожжа на Гомельшчыне сталі Буда-Кашалёўскі (больш за 105 тыс. т збожжа пры ўраджайнасці звыш 35 ц/га), Рэчыцкі і Рагачоўскі раёны (больш за 80 тыс. т кожны). Лепшымі па ўраджайнасці — саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна, ААТ «Отар» Чачэрскага раёна, РУП «Беларуснафта-Асобіна» Буда-Кашалёўскага раёна, гаспадаркі «Антонаўка-Агра» са Жлобіншчыны і «Тураўшчына» з Жыткавіцкага раёна.

У дзень святкавання «Дажынак — 2025» у Лельчыцах сапраўды адчувалася, што стаць сталіцай аграсвята — асаблівы гонар для невялікага райцэнтра. Жыхароў і гасцей Лельчыц чакалі на тэматычных падворках раёнаў Гомельскай вобласці. У кожнага была цудоўная магчымасць пазнаёміцца з унікальнай прадукцыяй і культурай прадстаўнікоў розных куткоў рэгіёна. На свяце можна было ацаніць і, безумоўна, сфатаграфавацца на выстаўцы караваяў і снапоў. Падворак Лельчыцкага раёна, дарэчы, стаў асабліва папулярнай фоталакацыяй. Тут выяву герба і сцяга роднай Беларусі вырабілі з ўласнага ўраджаю агародніны.

Наступнае абласное свята працаўнікоў вёскі прыме горад Калінкавічы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

Агульны валавы збор збожжавых, зернебабовых і рапсу ў Гомельскай вобласці склаў 1,053 млн тон. Сярэдняя ўраджайнасць па збожжавых і зернебабовых склала больш чым 30 цэнтнераў з гектара. Працягваецца ўборка кукурузы — аграрыі ўжо намалацілі 36 тысяч тон збожжа. Чакаецца, што выніковая лічба перавысіць 400 тысяч тон.


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ОАО «Н Холдинг»**
***проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности***
**ОАО «Минский завод «Термопласт»**

**Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Н Холдинг» по организации и проведению аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **ЛОТ № 1** | Изолированное помещение с инв. 500/D-1002997, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Седых, д. 66, пом. 1. Площадь – 1422,0 кв. м. Наименование – Спортивный комплекс, расположенный на 1 и 2 этажах (пристройка к средней школе № 114). Назначение – Помещение физкультурно-оздоровительного и (или) спортивного назначения. Обременение: аренда | | | | |
| **Начальная цена (стоимость) (в т. ч. НДС 20 %), BYN** | **1 184 400,00** | **Задаток, BYN** | **118 440,00** | **Шаг аукциона** | **5 %** |
| **Сведения о продавце, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «МИНСКИЙ ЗАВОД «ТЕРМОПЛАСТ» Республика Беларусь, 220103, г. Минск, ул. Кнорина, 50. Тел. +375172811340. E-mail: office@oaotermoplast.by | | | | |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Н Холдинг» 220029, г. Минск, пр. Машерова, 11, пом. 1. Тел. 8 029 754 63 46 (Мария) | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также в течение 3 (трех) рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 1 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона | | | | |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) в срок не позднее даты подачи заявления на участие в аукционе на следующие банковские реквизиты: р/с BY79 AKBB 3012 0000 1634 1000 0000 (BYN) в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, 220005, г. Минск, пр. Независимости, д. 56. Получатель – Открытое акционерное общество «Н Холдинг», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты объекта, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона | | | | |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **по 27 октября 2025 года (включительно)** в рабочие дни с 09.00 до 16.55 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1 | | | | |
| **Место, дата и время проведения аукциона** | Открытый аукцион состоится **28 октября 2025 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35-1, зал совещаний ОАО «Н Холдинг» | | | | |
| Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения | | | | | |



ИНФОРМАЦИЯ
О ПРЯМОЙ ПРОДАЖЕ ПУСТУЮЩЕГО ДОМА

*В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24.03.2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами»*

**ПРОДАЕТСЯ**

**одноэтажный бревенчатый одноквартирный жилой дом общей площадью жилых помещений 48 м² без хозяйственных построек, расположенный по адресу: д. Лиситник, пер. Центральный, д. 6, Березинского района Минской области на земельном участке 0,2 га.**

Цена пустующего жилого дома: одна базовая величина 42,00 (сорок два) белорусских рубля 00 копеек и дополнительно компенсация расходов, связанных с продажей дома.

С дополнительной информацией можно ознакомиться в извещении о продаже пустующего дома на официальном сайте Березинского районного исполнительного комитета (berezino.minsk-region.gov.by).

**Тел. 801715 64325.**

УНП 600092490



**Общество с ограниченной ответственностью «Цалкам»**, УНП 691432601, юридический адрес: г. Минск, ул. В. Хоружей, 10, к. 2,

ОБЪЯВЛЯЕТ О РЕОРГАНИЗАЦИИ В ФОРМЕ ВЫДЕЛЕНИЯ.

По всем вопросам обращаться по телефону +375297062513, на почту: г. Минск, 220036, а/я 103

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*«Настаўнік павінен быць больш чым святым чалавекам у школе! Таму трэба зрабіць максімум у гэтым плане. І перш за ўсё вы павінны гэта зрабіць, вы (настаўнікі) павінны гэтага захацець, а мы (улада) павінны аказаць усялякую падтрымку. Настаўнік — чалавек Прэзідэнта. Таму 50 працэнтаў вашай нагрузкі — гэта мая нагрузка».*

**На Рэспубліканскім педагагічным савеце, 27 жніўня 2024 года.**




# ВЫКЛАДЧЫК ДЛЯ ПЕДАГОГА

## Як нараджаюцца інавацыі, якія робяць вучобу творчай і пазнавальнай

Урокі павінны быць нясумнымі, а сустрэчы з настаўнікам — жаданымі. Трэба, каб на занятках панавала стваральная атмасфера творчасці і пошуку. У Беларусі існуе цэлая сістэма падтрымкі інавацый у адукацыі. Рэгулярныя конкурсы і спаборніцтвы для педагогаў дазваляюць вылучыць самыя эфектыўныя і крэатыўныя практыкі, якія потым прымяняюцца ў навучальным працэсе. А скарыстацца імі і зрабіць свае ўрокі ўнікальнымі і запамінальнымі дапамагаюць менавіта метадысты — так званыя настаўнікі для настаўнікаў.



— Іх роля ў перападрыхтоўцы педагогаў сапраўды неацэнная, — сцвярджае **рэктар Магілёўскага дзяржаўнага абласнога інстытута развіцця адукацыі Міхаіл ЖУДРО**. — Паспяховы метадыст — гэта не толькі тэарэтык, але і практык, які прайшоў доўгі шлях у школе. Такі спецыяліст ведае, як аб'яднаць акадэмічныя веды з патрабаваннямі штодзённай практыкі, пераўтвараючы навуковыя распрацоўкі ў канкрэтныя метадычныя рэкамендацыі, зразумелыя кожнаму настаўніку. Гэты пастаянны дыялог паміж тэорыяй і практыкай стварае ўнікальны сінергетычны эфект, які і забяспечвае якасны скачок у адукацыі. Наша ўстанова і ёсць тая самая прастора для прафесійнага станаўлення настаўніка, дзе нараджаюцца сучасныя педагагічныя ідэі, умацоўваюцца сувязі аднадумцаў і фарміруюцца стандарты якаснай адукацыі.

Акрамя павышэння кваліфікацыі інстытут прапануе педагогам вобласці шмат розных форм для ўдасканалення прафесійнай дзейнасці, сярод якіх навучальныя курсы, тэматычныя семінары, трэнінгі, практыкумы, майстар-класы. Менавіта сюды настаўнікі прыходзяць за прафесійнай падтрымкай і натхненнем.

— Дарэчы, метадыстамі становяцца найбольш вопытныя педагогі, якія дасягнулі высокага ўзроўню майстэрства, умеюць сістэмна думаць і натхняць калег, — удакладняе рэктар. — Задача метадыста — не толькі рэалізацыя дзяржаўнай адукацыйнай палітыкі і ўкараненне сучасных тэхналогій, але і фарміраванне прафесійнай супольнасці настаўнікаў.

Каб ісці ў нагу з часам, інстытут адкрывае новыя адукацыйныя пляцоўкі. Летась на яго базе пачаў працаваць цэнтр «Духоўнасць. Маральнасць. Патрыятызм». Ён спецыялізуецца на метадычным суправаджэнні педагогаў, якія выкладаюць адпаведны курс.

Інавацыйнай стажыровачнай пляцоўкай для педагогаў стаў STEM-цэнтр інстытута, дзе яны асвойваюць робататэхніку, лічбавыя тэхналогіі і сучасныя падыходы да навучання.

— Тут нараджаюцца ідэі, якія затым увасабляюцца ў школах вобласці, а метадысты дапамагаюць адаптаваць іх да рэальных умоў, — акцэнтуе рэктар. — Гэта тая прастора, дзе тэхналогіі сустракаюцца з педагогікай, а творчасць — з дакладнасцю.

Асобная ўвага ўдзяляецца патрыятычнаму выхаванню. Для гэтага быў створаны інфармацыйна-асветніцкі стэнд «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Ён наглядна дапамагае педагогам фарміраваць у падлеткаў пачуццё гістарычнай памяці і грамадзянскай адказнасці.

За першае паўгоддзе інстытут правёў больш як 500 разнастайных адукацыйных мерапрыемстваў для спецыялістаў сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі рэгіёна, удзельнікамі якіх стала звыш 18 тысяч чалавек.

— Праз пастаянны пошук, навучанне і абмен вопытам ствараецца тое творчае адукацыйнае асяроддзе, дзе веды становяцца жывымі, а вучоба — цікавай і жаданай, — рэзюмуе Міхаіл Жудро.




# «НА ЎРОКІ МАЙГО НАСТАЎНІКА ЗАЎСЁДЫ ХАЦЕЛАСЯ ІСЦІ...»

## Напярэдадні свята даведаліся, хто і чаму выбірае няпросты, але пачэсны шлях

Аб тым, хто ён, сапраўдны настаўнік, адкуль педагогі чэрпаюць натхненне і каго ставяць сабе ў прыклад — у матэрыяле нашых карэспандэнтаў.

### «МАЕ ВЫКЛАДЧЫКІ СТАЛІ МАІМІ КАЛЕГАМІ»

Аіда Аліярава вучылася ў СШ № 11 імя генерала арміі А. І. Антонава г. Гродна. Гэтая ж установа стала яе першым працоўным месцам. Школьныя гады ўспамінае з вялікай цеплынёй. Асабліва ўрокі англійскай мовы, дзе выкладаў Андрэй Лобан. Здавалася б, яшчэ ўчора яны былі вучнем і настаўнікам, а сёння — калегі.

Дзякуючы гутарцы з Аідай Аліяравай і Андрэем Лобанам, змагла на свае вочы назіраць, што дабро і натхненне сапраўды перадаецца ад чалавека да чалавека і жыве далей. Настаўнік маладога педагога родам з Ліды. Ён з вялікім цяплом гаварыў пра сваю настаўніцу англійскай мовы, якая прывіла яму любоў да гэтага прадмета і, можна сказаць, вызначыла яго будучы лёс. «Наогул, я не планаваў станавіцца настаўнікам, таму што нарадзіўся ў сям'і ўрачоў. І ўсе думалі, што працягну справу бацькоў, але з хіміяй і біялогіяй у мяне неяк не задалося. Не, адзнакі былі выдатныя, школу скончыў з залатым медалём, але вось не ляжала душа. Англійскую мову ў мае школьныя гады пачыналі вучыць з 5 класа. Да самага выпускнога ў мяне быў адзін настаўнік — Тамара Львоўна Някрасава. Яна «заразіла» мяне цікавасцю да мовы. Тады ж не было ні камп'ютараў, ні мультымедыйных тэхналогій. Што ўжо казаць, нават і падручнікаў толкам не было. Але кожны яе занятак быў вельмі цікавы. На кожным уроку ў нас быў жывы дыялог», — расказвае Андрэй Сяргеевіч.

У адзінаццатай гродзенскай школе ён працуе ўжо 20 гадоў. За гэты час падрыхтаваў мноства вучняў, і нямала з іх пайшлі па яго шляху. Сярод іх і Аіда Аліярава. Дзяўчына адзначае, што ёй заўсёды падабалася вучыцца, даведвацца пра новае. Таму яна ўдзельнічала ў алімпіядах, конкурсах і творчых праектах разам са сваім настаўнікам. «На ўрокі Андрэя Сяргеевіча заўсёды хацелася ісці. І не толькі мне, усім было цікава. Я з захапленнем назірала за тым, як ён працуе. Таму нядзіўна, што вырашыла прафесійна вывучаць англійскую мову, у гэтым выбары ён адыграў вялікую ролю. Але, як і мой настаўнік, першапачаткова я не бачыла сябе ў гэтай сферы. Але потым памяняла сваё меркаванне і канчаткова ўпэўнілася ў яго правільнасці, калі пачала працаваць. Цяпер я і выкладаю, і вяду класнае кіраўніцтва, і дакладна ведаю, што знаходжуся на сваім месцы».

Аіда Аліярава адзначыла, што вельмі любіць сваю родную школу. Калі дзяўчына шукала працу, то ўбачыла, што ёсць вакансія ў СШ № 11. Вырашыла вярнуцца ў родныя мясціны і паспрабаваць тут сябе ў ролі настаўніка. «Першы час было вельмі нязвычна выконваць ролю настаўніка ў роднай школе. Мае выкладчыкі сталі маімі калегамі, вельмі незвычайныя адчуванні. Не магла паверыць у тое, што я цяпер з імі ў настаўніцкай, а не ў класе, што мы з імі абмяркоўваем часопісы, расклад, а Андрэй Сяргеевіч вядзе англійскую ў маім класе. Але я заўсёды адчувала і адчуваю падтрымку ад сваіх старэйшых калег, адміністрацыя школы таксама заўжды побач. Так што ні разу не пашкадавала аб тым, што выбрала для працы родную школу».

Мае суразмоўцы адзначаюць, што прафесія настаўніка сапраўды вельмі годная і важная, бо шлях кожнага чалавека ў гэтым жыцці пачынаецца з навучання.

«Думаю, заходзячы ў клас, важна быць сабой. Імкнуцца зразумець дзяцей, быць з імі на адной хвалі, не баяцца выяўляцца. Бо калі вы не будзеце баяцца, то ім не страшна будзе ўдзельнічаць у конкурсах, адказваць, выступаць. Насамрэч для педагога вельмі важна, каб дзеці яму давяралі», — адказала Аіда Аліярава на пытанне, які ён — добры настаўнік.

Да разважання далучыўся Андрэй Лобан: «На мой погляд, добры настаўнік — гэта розны настаўнік. Ён, як ніхто іншы, праяўляе сябе ў разнастайных кірунках. Гэта не толькі падрыхтоўка да ўрока, але і навуковая праца, падрыхтоўка да алімпіяд. Я нават да песенных і прамоўніцкіх конкурсаў дапамагаю рыхтавацца...»

### «СЮДЫ ХОЧАЦЦА ВЯРТАЦЦА»

Вуцеўская сярэдняя школа Добрушскага раёна Гомельскай вобласці даўно вядомая далёка не толькі за межамі раёна, вобласці, але і ў рэспубліканскім педагагічна-вучнёўскім асяроддзі.

Сюды прыходзяць не толькі па веды, але і па ўменне думаць, аналізаваць і ствараць. Вуцеўская сярэдняя школа — узорная навучальная ўстанова вобласці і апорны цэнтр экалагічнага выхавання. Яе вучні штогод перамагаюць у раённых, абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. На базе ўстановы адукацыі створаны ўнікальны вучэбна-даследчы ўчастак, кіпіць работа педагогаў і вучняў у школьных лабараторыях.

Адзін з актыўных папулярызатараў навукова-даследчага руху сельскай школы — настаўніца біялогіі і геаграфіі Вуцеўскай сярэдняй школы Ірына Ярцава. Яе ўласная гісторыя ў прафесіі пачалася амаль дваццаць гадоў таму. У Вуці пачала выкладаць яшчэ маладым спецыялістам. Тады Ірына Міхайлаўна і ўявіць не магла, што спачатку такія сціплыя навукова-даследчыя пачынанні яе, яе калег і вучняў вырастуць у цэлую экалагічную праграму, вядомую на ўсю вобласць. Ірына Міхайлаўна ўспамінае, як усё пачыналася з маленькага прышкольнага ўчастка і некалькіх простых доследаў на ўроках біялогіі. Паступова яе захапленне навукай і прыродай перадалося вучням, і вось ужо былыя школьнікі прыводзяць да яе сваіх дзяцей.

Адным з цікавых навукова-даследчых праектаў педагога Ірыны Ярцавай і яе вучняў стаў, напрыклад, пошук адказу на глабальнае пытанне: куды дзяваць пластыкавыя адходы? У лабараторыі школы неўтаймаваныя вуцеўскія даследчыкі атрымалі ўзоры палімерасфальтабетоннага пакрыцця, а пасля выпрабавалі іх і нават уклалі частку школьнага двара. Ірына Ярцава заахвочвае сваіх вучняў спалучаць даследчую дзейнасць з працай на прышкольным участку. Дзеці пад кіраўніцтвам педагога эксперыментуюць на зямлі і фіксуюць свае назіранні на паперы. З дапамогай настаўніцы, напрыклад, упершыню вырасцілі бамію, артышок, стэвію — знайшлі рэцэпт хрумсткіх чыпсаў з баміі, а стэвію прапаноўваюць выкарыстоўваць у якасці замяняльніка цукру.

Галоўнае — любоў да прадмета і дзяцей, якая ператварае стандартныя ўрокі ў захапляльнае падарожжа... Такім сакрэт поспеху работы з вучнямі бачыць Ірына Міхайлаўна: «На сваім вопыце пераканалася, што вельмі натхняе дзяцей вучыцца, дакопвацца да нечага цікавага, тварыць. Калі яны бачаць вынік сваёй справы, то працуюць старанна і пачынаюць шанаваць працу іншых. Ад гэтага непасрэднага творчага зараду дзяцей зараджаецца і педагог».

Былая вучаніца Ірыны Ярцавай, а цяпер яе маладая калега — настаўніца хіміі Вуцеўскай сярэдняй школы Вольга Савянок — найлепшы доказ таго, як педагог можа пасадзіць, дагледзець «маленькае зярнятка», што вырасце ў прафесіі і знойдзе сваё прызначэнне. «Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся. Гэта пра мяне», — з цёплай усмешкай прадстаўляецца Вольга Савянок. Пяты год як Дзень настаўніка — гэта і яе прафесійнае свята.




**Вольга САВЯНОК.**

Яшчэ школьніцай пад кіраўніцтвам Ірыны Ярцавай Вольга захапілася даследчымі праектамі. Займаліся стварэннем магнітнай вадкасці для ачысткі вады ў мясцовай рэчцы Вуць, вынаходзілі супрацьгалалёдны рэагент, які рабілі на аснове бурачнага соку. Таленавітую вучаніцу тройчы адзначалі Прэміяй спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пасля вучобы ў ГДУ імя Францыска Скарыны дыпламаваным спецыялістам дзяўчына вярнулася ў родныя сцены ўжо настаўніцай і... адразу пачала заахвочваць ужо сваіх вучняў на навуковую дзейнасць!

Вольга ўспамінае: «Менавіта Ірына Міхайлаўна яшчэ з восьмага класа захапіла даследчай работай. Для мяне асабіста школьны вопыт увогуле быў вельмі каштоўны. Я ганаруся тым, што нарадзілася ў вёсцы. Шчаслівая, што вярнулася працаваць у родную школу. Мая гісторыя — прыклад таго, як можна вучыцца, развівацца і знайсці сваё месца ў сельскай мясцовасці».

**Матэрыялы падрыхтавалі Нэлі ЗІГУЛЯ, Аміна НАЗАРАВА, Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ, Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота аўтараў і з архіваў герояў публікацыі.**

# НАВУЧЫЦЬ ПРАФЕСІІ І САМАСТОЙНАМУ ЖЫЦЦЮ

## Як майстры і выкладчыкі індустрыяльна-педагагічнага каледжа дапамагаюць студэнтам атрымаць спецыяльнасць

Выхаваць прафесіянала сваёй справы, спецыяліста, гатовага да працоўных будняў, — важная місія любой навучальнай установы. У філіяле «Індустрыяльна-педагагічны каледж» Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі ўпэўнены: сакрэт поспеху крыецца ў майстрах і выкладчыках. Напярэдадні Дня настаўніка пра складанасці і асаблівасці іх прафесій даведалася газета «Звязда».

### ГЭТА ВАМ НЕ ШКОЛА...

У каледжах па-іншаму будуецца адукацыйны працэс: больш самастойнай працы, лекцыйнага матэрыялу, менш сшыткаў і падручнікаў. Нядзіўна, што першы час могуць узнікнуць непаразуменні: патрабаванні ў школьных настаўнікаў і выкладчыкаў каледжа ўсё ж такі адрозніваюцца. Ірына Сіліна — выкладчык такіх прадметаў, якія забяспечваюць пачатковую падрыхтоўку майстра вытворчага навучання і настаўнікаў тэхнічнай працы і чарчэння, — упэўнена, што большая частка праблем вырашаецца гумарам: «Калі з сітуацыі можна пасмяяцца разам, напружанне сыходзіць. Чалавек перастае быць «злючкай-калючкай» і ператвараецца ў таварыша, з якім ужо можна разам грызці граніт навукі».



Дар'я НІКАНОВІЧ.

Ірына Вальдэмаўна выкладае ў каледжы вось ужо 25 гадоў. «Помню свой першы працоўны тыдзень і тое, як разгубілася, убачыўшы перад сабой дарослых хлопцаў і дзяўчат. Шчыра прызнаюся, далей за трэцюю парту нібы нічога не бачыла. Розніца паміж навучаннем у школе і ў каледжы, безумоўна, вялікая. Іншая адказнасць у тым ліку і ў куратара групы — дзесьці нават больш, чым у класнага кіраўніка. Перад табой ужо дарослыя людзі, і здолець іх зацікавіць не толькі сваім прадметам, але і культурай, мастацтвам, грамадскім жыццём трэба яшчэ ўмець».

Ірына Вальдэмаўна са слязамі радасці на вачах успамінае сваю першую куратарскую групу. Выкладчыцы было ўсяго 23 гады, а яе студэнты, тады ўжо другакурснікі, ненашмат яе маладзейшыя. «Калі яны вярнуліся з практыкі і ўбачылі маладога куратара, мабыць, вырашылі, што заняткі можна і прагульваць. Але я не здалася. Па раніцах прыходзіла да іх у інтэрнат, стукала ў кожныя дзверы, будзіла — літаральна выганяла на пары. Паступова яны зразумелі, што прасцей прыходзіць своечасова, — з усмешкай успамінае Ірына Вальдэмаўна. — Вядома, мы прыціраліся адно да аднаго. Студэнты здзіўляліся: як гэта так, маленькая маладзенькая дзяўчына можа патрабаваць ад іх парадку? Але кантакт мы знайшлі. І я дагэтуль ганаруся той групай: нашы адносіны засталіся цёплымі, чалавечымі. У мінулым годзе, напрыклад, яны віншавалі мяне з юбілеем».

### ПРАВЕРКА НА ТРЫВАЛАСЦЬ

Якімі якасцямі павінен валодаць майстар вытворчага навучання? На думку Дар'і Нікановіч, маладога спецыяліста гэтай прафесіі, у першую чаргу цярпеннем і моцнай нервовай сістэмай. Працаваць з амаль равеснікамі дзяўчыне часам бывае няпроста. Але, паводле яе слоў, студэнты хутка перастройваюцца і ставяцца да яе з павагай. «Часам сваімі паводзінамі яны нібыта правяраюць нас, майстроў і выкладчыкаў, на трываласць. Але ў выніку ўсё роўна разумеюць, што стаць добрым спецыялістам дазволяць толькі веды і працавітасць. А мы на гэтым шляху дапаможам», — адзначае майстар. Дар'я Уладзіміраўна працуе ў індустрыяльна-педагагічным каледжы ўжо год: сама скончыла ўстанову і вырашыла застацца.

Хоць у майстроў няма такога цеснага кантакту са студэнтамі, як у куратараў, за два тыдні заняткаў па 6-7 гадзін у дзень хлопцы і дзяўчаты ўсё роўна прывыкаюць, раскрываюцца, дзеляцца сваімі перамогамі і няўдачамі: «Бывае, хтосьці сядзіць пануры, бо нічога не ладзіцца, а потым, у канцы другога тыдня практыкі, раптам ускоквае з зззяючымі вачыма: «Атрымалася! Атрымалася!» Часам, на жаль, даводзіцца і супакойваць: «Не хвалюйся, можа, тынкоўка не тваё, але станеш выдатным мулярам, плітачнікам або маляром». І ўсё ж самыя ўпартыя спрабуюць раз за разам, пакуль не даб'юцца выдатнага выніку.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**

**Встроенное офисное помещение 491,1 кв. м** (инв. номер 710/D-54707). **Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 38а.**
***Обременение***: площади помещения сданы в аренду.
Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 970 800,00 бел. руб.** (снижена на 19 %)

**Лоты №№ 4 – 23**

| № лота | Наименование | Начальная цена лота, бел. руб. |
|---|---|---|
| **2** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000051) | **8 329,16** |
| **3** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000054) | **7 965,96** |
| **4** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000056) | **8 196,37** |
| **5** | **Пресс для вулканизации высокой обуви 100368/Р1** (инв. № 1652) | **3 027,67** |
| **6** | **Линия автоматизир. для изготовления обуви из полимерных материалов, модель Л 2/6,** 1988 г. в. (инв. 449) | **29 487,97** (снижена на 30 %) |

**Месторасположение: лоты №№ 2–4 – Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское, 8/85, лоты №№ 5, 6 – Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1**

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя**

Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя по лоту № 1 может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3 лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи, при первоначальном платеже не менее 20 % от цены продажи с учетом ранее внесенной суммы задатка

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – 0,5 %, по лотам №№ 2–4 – 8 %, лот № 5 – 4 %, лот № 6 – 4 % от итоговой цены лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1–4 – 11.06.2025, по лотам №№ 5, 6 – 19.02.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.10.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Могилевоблавтотранс»**

**Аукцион состоится 29.10.2025 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

**Лот № 1.**

**Капитальное строение с инв. № 720/С-10382 – Котельная,** площадь – 566,7 кв. м,
назначение: здание специализированное иного назначения, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 722050100001007629 (право постоянного пользования, площадь 0,3874 га) по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Вокзальная, 59В.

***Начальная цена продажи: 87 215,64 бел. руб. с учетом НДС.***
***Сумма задатка: 8 721,56 бел. руб.***

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: по 28.10.2023 до 11.00.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в извещении о проведении аукциона, опубликованном на торговой площадке Организатора аукциона GOSTORG.BY.

Продавец: ОАО «Могилевоблавтотранс» (г. Могилев, ш. Гомельское, 1, тел. 8-0222-33-05-39).

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

# ЗВЫШ 13 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ

## Золатавалютныя рэзервы Беларусі абнавілі свой гістарычны максімум

Паводле звестак Нацбанка, па стане на 1 кастрычніка міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі склалі 13 мільярдаў 284 мільёны долараў ЗША.

У структуры актываў павялічыўся аб'ём манетарнага золата, які склаў 6,62 мільярда долараў ЗША супраць 5,93 мільярда месяцам раней, забяспечыўшы за месяц рост на 10,5 %.

Рэзервовыя актывы ў замежнай валюце таксама падраслі і склалі 5,24 мільярда долараў ЗША, павялічыўшыся ў параўнанні з вераснёўскімі паказчыкамі на 3,5 % — па стане на 1 верасня рэзервовыя актывы ў замежнай валюце дасягалі 5,06 мільярда долараў.

Такім чынам, міжнародныя рэзервовыя актывы нашай краіны ў чарговы раз перавысілі свой гістарычны максімум.

Згодна з мэтавымі паказчыкамі грашова-крэдытнай палітыкі, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў Беларусі на канец 2025 года павінен скласці не менш за 7,1 мільярда долараў.

Трэба сказаць, што з пачатку года ЗВР выраслі амаль напалову — на 49 % (на 4,36 мільярда долараў ЗША).

Што такое ЗВР і навошта яны патрэбныя?

ЗВР — гэта высокаліквідныя актывы дзяржавы, імі яна можна скарыстацца ў выпадку дэфіцыту плацежнага балансу. Пакрыць гэты разрыў важна, каб пазбегнуць дэвальвацыі нацыянальнай валюты, інфляцыі і крызісу. Таксама актывы могуць выкарыстоўвацца ў выпадку любой іншай патрэбы. Такі залаты запас краіны.



# БЫЦЬ ПАЧУТЫМ

## Мінэканомікі адкрывае серыю «дыялогавых пляцовак» у рэгіёнах па абмеркаванні пытанняў, якія хвалююць бізнес

Днямі намеснік міністра эканомікі Кірыл Машарскі наведаў з рабочым візітам Гомельскую вобласць. Асноўная мэта — выявіць праблемныя пытанні, з якімі сутыкаюцца суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці на месцах, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.




Кірыл Машарскі прыняў удзел у пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Гомельскім аблвыканкаме. У ходзе канструктыўнай гутаркі з прадстаўнікамі дзелавой супольнасці рэгіёна абмяркоўваліся практычныя рашэнні, рэалізацыя якіх спрыяла б паляпшэнню ўмоў вядзення бізнесу.

Намеснік кіраўніка эканамічнага ведамства наведаў цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва ТАА «Светлагорскі дзелавы партнёр» і ТАА «Фінансавы рай» і бізнес-інкубатар «Карал» у абласным цэнтры. Таксама Кірыл Машарскі азнаёміўся з работай прадпрыемства — рэзідэнта СЭЗ «Гомель-Ратон» ТАА «Амета-Электрод».

НАПЯРЭДАДНІ

# ЕЎРАЗІЙСКІ САЮЗ БУДЗЕ АБАРАНЯЦЬ

Як не дапусціць крыміналізацыі бізнесу праз нелегальны абарот, абмяркуюць удзельнікі XIII Міжнароднага форуму «Антыкантрафакт-2025», які пройдзе ў Мінску 6—7 кастрычніка.

ЕАЭС рыхтуе рашэнне, неабходнае для барацьбы з парушэннямі інтэлектуальнай уласнасці ў інтэрнэце. Як паведаміў **дырэктар дэпартамента развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці ЕЭК Ернар БАКЕНАЎ**, часам нядобрасумленныя ўдзельнікі рынку выкарыстоўваюць развіццё лічбавых тэхналогій і заканадаўчыя прабелы для абыходжання абмежаванняў. «Гэта прыводзіць да пэўнага напаўнення рынку кантрабанднымі таварамі і парушэння інтэлектуальнай уласнасці ў лічбавым асяроддзі, — адзначыў эксперт. — Мы назіраем рост колькасці парушэнняў правоў інтэлектуальнай уласнасці ў лічбавым асяроддзі».

## АБАРОТ ФАЛЬСІФІКАТУ — ЗВЫШ 3 ТРЫЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Амаль 1,5 тысячы парушэнняў у сферы інтэлектуальнай уласнасці зафіксавана ў 2024 годзе ў краінах Еўразійскага эканамічнага саюза. «Значны рост паказваюць па выяўленых парушэннях Арменія, Рэспубліка Казахстан, Кыргызстан. У Беларусі захаваўся ранейшы ўзровень выяўленых парушэнняў. Калі браць 10-гадовы перыяд, з 2015-га да 2024-га, то больш за 140 мільёнаў адзінак кантрафактнай прадукцыі было канфіскавана», — расказаў Ернар Бакенаў.

Ён растлумачыў, што традыцыйна пераважаюць парушэнні, якія датычацца таварных знакаў, — на гэтую катэгорыю прыпадае амаль 90 % зафіксаваных фактаў. Таксама каля 9 % складаюць парушэнні аўтарскіх і сумежных правоў. Паводле інфармацыі Ернара Бакенава, толькі ў мінулым годзе ў Расіі ў рамках працэдуры дасудовага абмежавання доступу Раскамнагляд прыняў меры па абароне 24 329 аб'ектаў аўтарскіх і сумежных правоў. На падставе рашэнняў суда доступ на пастаяннай аснове быў абмежаваны да 407 інтэрнэт-рэсурсаў гэтай краіны.

Акрамя таго, паводле інфармацыі дырэктара гэтага дэпартамента, у 2024 годзе на падставе 94 судовых рашэнняў было выдалена або заблакіравана 130 сайтаў, якія парушаюць правы на таварныя знакі. Як паведаміў Ернар Бакенаў, ЕАЭС распрацоўвае пагадненні аб узгодненых падыходах у барацьбе з парушэннямі правоў на аб'екты інтэлектуальнай уласнасці ў сетцы інтэрнэт. У прыватнасці, ужо завершана ўнутрыдзяржаўнае ўзгадненне праекта гэтага дакумента. «Пагадненне дазволіць праваўладальнікам бяспечна размяшчаць свае творы на легальных інтэрнэт-рэсурсах і атрымліваць адпаведныя даходы», — растлумачыў эксперт.

Штогадовы абарот кантрафактнай прадукцыі складае ў свеце як мінімум 500 мільярдаў долараў, а ў цэлым увесь

# ПУНКТЫ ПРЫЦЯГНЕННЯ

## «Дні Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)» адкрыліся ў Жэневе

У Палацы Нацый — штаб-кватэры аддзялення арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Жэневе (Швейцарыя) — адбылося афіцыйнае адкрыццё «Дзён Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС)», паведамілі ў прэс-службе ЕЭК.



Рэспубліка Беларусь, якая старшынстве ў органах ЕАЭС у 2025 годзе, падтрымала ініцыятыву Еўразійскай эканамічнай камісіі аб правядзенні знакавага мерапрыемства і ўнесла значны ўклад у яго арганізацыю, адзначылі ў Міністэрстве замежных спраў.

У знешнепалітычным ведамстве дадалі, што на цырымоніі адкрыцця «Дзён ЕАЭС» выступілі **генеральны дырэктар аддзялення ААН у Жэневе Таццяна Валавая, Старшыня Калегіі ЕЭК Бакытжан Сагінтаеў і** пастаянны прадстаўнік Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Жэневе Ларыса Бельская.

Мерапрыемствы «Дзён ЕАЭС» наведалі прадстаўнікі дзяржаў з усіх рэгіёнаў свету. Цэнтральнай падзеяй стала выстаўка, прысвечаная багатаму турыстычнаму патэнцыялу дзяржаў еўразійскай пяцёркі. У ліку беларускіх экспанатаў былі прадстаўлены прыродны запаведнік «Белавежская пушча», мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», замкавы комплекс «Мір», унікальная архітэктура Траецкага прадмесця ў Мінску і Дом-музей сусветна вядомага мастака Марка Шагала ў Віцебску.

Вялікую цікавасць у гасцей мерапрыемства выклікаў стэнд, прысвечаны развіццю прамысловага турызму ў нашай краіне, асабліва ўвагу прыцягнуў экскурсійны тур на БЕЛАЗ — адзін з флагманаў індустрыялізацыі і тэхналагічнага развіцця сучаснай Беларусі.

На круглым стале «Рэгіянальная эканамічная інтэграцыя ЕАЭС: вынікі за 10 гадоў і перспектывы партнёрства» разам з кіраўнікамі Еўразійскай эканамічнай камісіі і дыппрадстаўніцтваў краін еўразійскай пяцёркі — Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана і Расіі, выступілі кіраўнікі і эксперты профільных міжнародных арганізацый, уключаючы Еўрапейскую эканамічную камісію ААН, Сусветную гандлёвую арганізацыю, канферэнцыю ААН па гандлі і развіцці, Міжнародную арганізацыю па міграцыі, Міжнародную арганізацыю працы і Сусветную арганізацыю інтэлектуальнай уласнасці.




**Пастаянны прадстаўнік Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Жэневе Ларыса Бельская** і **дырэктар дэпартамента знешнеэканамічнай дзейнасці МЗС Беларусі Андрэй Пракапчук** звярнулі ўвагу ўдзельнікаў круглага стала на прыярытэтаў беларускага старшынства ў органах ЕАЭС у галіне ўмацавання прамысловай кааперацыі, развіцця тэхналагічнага патэнцыялу і лічбавай трансфармацыі, павышэння харчовай бяспекі, паскарэння інтэграцыі ў сферы паслуг, фарміравання адзінай транспартнай прасторы і развіцця міжнароднага супрацоўніцтва. Беларускія дыпламаты таксама акцэнтавалі бачанне кіраўніцтвам нашай краіны ключавых напрамкаў далейшага развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі.

— Дні ЕАЭС у аддзяленні ААН у Жэневе сталі важным крокам ва ўмацаванні міжнароднага пазіцыянавання і аўтарытэту ЕАЭС як паспяховай і перспектыўнай мадэлі інтэграцыі, — падкрэслілі ў знешнепалітычным ведамстве, адзначыўшы, што ўдзельнікі намецілі новыя перспектывы супрацоўніцтва ЕАЭС з ААН і спецыялізаванымі міжнароднымі арганізацыямі.

# СВАЕ ПРАВЫ І Ў ІНТЭРНЭЦЕ

АНТИ КОНТРАФАКТ МЕЖДУНАРОДНЫЙ ФОРУМ

рынак фальсіфікаванай прадукцыі перавышае 3 трыльёны долараў, паведаміў **намеснік старшыні Камітэта па эканамічнай палітыцы Дзярждумы Федэральнага сходу Расіі, член апякунскага савета Міжнароднай асацыяцыі «Антыкантрафакт» Арцём КІР'ЯНАЎ**.

## У ПАГОНІ ЗА «ГУЧНЫМІ» БРЭНДАМІ

Большасць кантрафактных тавараў, выяўленых на тэрыторыі нашай краіны, паступаюць з трох дзяржаў: Кітая, Літвы і Германіі. Аб гэтым заявіў **генеральны дырэктар Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Беларусі Аляксей КУРМАН**.

Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці сумесна з Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях Беларусі працуе над тым, каб наша краіна была дзяржавай, дзе вынікі інтэлектуальнай дзейнасці належным чынам захоўваюцца і абараняюцца. Але парушэнні, на жаль, яшчэ застаюцца.

Летась у Беларусі было выяўлена 41 парушэнне на аб'ектах інтэлектуальнай уласнасці, што адпавядае ўзроўню 2023 года. Напрыклад, за 2021—2024 гады мытныя органы нашай краіны накіравалі больш за 200 спраў па факце незаконнага выкарыстання аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці і перамяшчэння тавараў за мяжу. Часцей за ўсё кантрафактнымі з'яўляюцца тавары штодзённага попыту, парфумерыя, касметыка, маторнае масла і аўтамабільныя запчасткі. Больш за 90 % падробак у апошнія гады пераважна ўвозіцца да нас з Кітая, Літвы, Германіі і іншых краін.

На думку генеральнага дырэктара, барацьба з фальшывай прадукцыяй — гэта сістэмная і шматузроўневая праца, у якой задзейнічаны ўсе зацікаўленыя арганізацыі. «У першую чаргу я падзяляў бы гэтую дзейнасць на некалькі блокаў. У першы ўваходзіць работа ўнутры Беларусі і супрацьдзеянне ўвозу прадукцыі, дзе ключавую ролю адыгрываюць Дзяржаўны мытны камітэт і Нацыянальны мытны рэестр аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці. Да другога блока можна аднесці аказанне садзейнічання нашым прадпрыемствам-экспарцёрам у якаснай і належнай ахове і абароне прадукцыі на знешніх рынках. Гэтым займаецца Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці. Мы праводзім тлумачальную работу сярод насельніцтва, супрацоўнічаем з партнёрамі ў краінах ЕАЭС і «далёкай дугі», куды экспартуецца наша прадукцыя, каб сярод беларускіх тавараў не было падробак», — дадаў Аляксей Курман.

Вялікі блок работы арганізацыі — правядзенне розных мерапрыемстваў, у тым ліку семінараў, форумаў, канферэнцый, круглых сталоў па непрыманні кантрафактных тавараў. Сёння ў асноўнай групе рызыкі знаходзіцца моладзь, якая ў пагоні за моднымі тэндэнцыямі гатовая ахвяраваць якасцю прадукцыі, каб купіць «гучны» брэнд, заключыў Аляксей Курман.

**Сяргей КУРКАЧ.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор электронных торгов** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | Могилевский лесхоз, г. Могилев, ул. Крупской, 140. УНП 700336549 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191 224 638. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

| № лота | Предмет электронных торгов | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | Машина погрузочно-транспортная МПТ-461.1, (в составе с **трактором «Беларус-82.2»**, рег. № ТВ-6 1648, зав. № 172001952, 2012 г. в. и **полуприцепом ПЛ-9,** рег. № БЮ 3372, зав. № 1002 (0450), 2013 г. в.) | **24 240,00** (снижена на 60 %) |
| 2 | **Грузовой лесовоз «УРАЛ 4320»,** рег. № ТВ 1654, кузов № 012183, 1982 г. в. | **6 552,00** (снижена на 40 %) |

**Местонахождение – г. Могилев, ул. Крупской, 140**

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 11.10 31.10.2025.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.10.2025** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Извещение о проведении электронных торгов опубликовано на сайте Госкомимущества (https://au.nca.by/)

**Контактные телефоны:** +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
**E-mail:** auction@cpo.by



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**в г. п. Плещеницы, ул. 8-е Марта, д. 7 Логойского района Минской области**

Плещеницкий сельский исполнительный комитет в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **г. п. Плещеницы, ул. 8-е Марта, д. 7** Логойского района Минской области (правообладатель – Малиновский Анатолий Францевич).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В.И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-6-35.

УНП 600181684



ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**в д. Слобода, ул. Полевая, д. 2, кв. 2 Логойского района Минской области**

Плещеницкий сельский исполнительный комитет в рамках работы Указа Президента Республики Беларусь № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» разыскивает собственников, наследников и лиц, имеющих право пользования жилым домом, расположенным по адресу: **д. Слобода, ул. Полевая, д. 2, кв. 2** Логойского района Минской области (правообладатель – Бурова Оксана Георгиевна).

Сельисполком просит граждан, располагающих информацией о собственниках, наследниках и лицах, имеющих право пользования жилым домом, сообщить в Плещеницкий сельисполком по адресу: 223130, Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. В.И. Ленина, д. 7 либо по телефонам: (801774) 22-3-35; 22-6-35.

УНП 600181684



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ НА 98 %

**Организатор аукциона:**
**ЗАО «Оценка Сервис», г. Гомель, ул. Лепешинского, 1**
**Продавец:**
**КПУП «Хойникский ремонтный завод», г. Хойники, ул. К. Маркса, 39 – в лице ликвидатора Насонова В.В.**

**Торги состоятся 20 октября 2025 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 6Б, 2-й этаж, каб. 28**

Подробный перечень имущества, лоты №№ 2, 5, 21, порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участников торгов, порядок проведения аукциона и условия размещены на сайте Гомельского областного исполнительного комитета – gomel-region.by в разделе «Экономика / Продажа-аренда», далее – «Извещения о проведении аукционов по продаже иного имущества», на сайте Организатора торгов – www.ocenkaservis.by в разделе Аукционы – «Очные торги».

*Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Хойніцкія навіны» от 22.03.2025 г., от 05.04.2025 г., в газете «Звязда» от 22.03.2025 г.*

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 06.10.2025 по 16.10.2025 с 9.00 до 16.00.**

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (033) 634-86-95, **Насонов Николай Владимирович (запись на осмотр имущества);** 8 (029) 835-67-42, **Насонов Владимир Валерьевич.**

**Контактные данные организатора аукциона:**
**(тел./факс) 8 (0232) 51-22-17, 8 (029) 651-22-19.**
**E-mail: ocenkaservis.gomel.by@mail.ru**

УНП 400056442

# ЗАНЯТАСЦЬ БЕЗ МЕЖ

## Кірмаш вакансій для пажылых і інвалідаў сабраў дзясяткі сталічных работадаўцаў і сотні суіскальнікаў

Калі чалавек выходзіць на пенсію або сутыкаецца з інваліднасцю, то часта аказваецца як бы на ўзбочыне: апроч заробку губляецца адчуванне ўласнага месца ў грамадстве, магчымасць быць запатрабаваным і карысным. Таму і рыхтуюцца кірмашы вакансій, якія садзейнічаюць працаўладкаванню грамадзян пенсіённага ўзросту і інвалідаў. Удзельнікі мерапрыемства, арганізаванага Мінгарвыканкамам у гандлёвым цэнтры «Сталіца», — транспартныя арганізацыі, прадпрыемствы прамысловасці, гандлю і грамадскага харчавання, гасцінічнага і рэстараннага бізнесу Мінска — выступілі са шматлікімі прапановамі. Каля 40 наймальнікаў прадставілі на кірмашы каля 2000 прапаноў. Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся на мерапрыемства, каб даведацца, якую работу прапаноўвалі, а якую шукалі.




### У ЦАНЕ — ШМАТГАДОВЫ ДОСВЕД

«Сёння працаўладкаванне не адбудзецца, але можна дамовіцца аб паўторнай кансультацыі або суразмоўі. Звычайна тыя, хто прыходзіць на такія мерапрыемствы, знаходзяць працу на працягу двух-трох тыдняў, — адзначыла **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама — начальнік упраўлення занятасці насельніцтва Таццяна КУДЗЕВІЧ.** — Усё залежыць ад жадання і матывацыі. Па статыстыцы прыкладна кожны трэці ўдзельнік, калі праяўляе належную актыўнасць, уладкоўваецца на працу».

Прычым большасць работадаўцаў — дзяржаўныя арганізацыі і прадпрыемствы, якія шукаюць вопытных, адказных і матываваных спецыялістаў. **Начальнік аддзела кадраў інструментальна-штампавага завода МАЗ Аляксандр КАРЦЕЛЬ** расказаў: «Вытворчасць у нас спецыфічная: цэніцца досвед, без якога немагчыма стаць сапраўдным спецыялістам. Шлях да прафесіі доўгі і складаны, далёка не кожны гатовы яго прайсці. На канвееры ўсё значна прасцей: некалькі разоў паказаў, як трэба рабіць, і чалавек ужо можа стаяць на лініі і выконваць адну і тую ж аперацыю. А ў слесара-інструментальшчыка задачы шматгранныя, работа патрабуе рэдкіх ведаў і навыкаў. Таму наша прадпрыемства прадстаўлена сёння тут, на кірмашы вакансій. Мы прапануем працаўладкаванне людзям «сярэбранага» ўзросту. Дарэчы, на нашым заводзе сёння працуе каля 600 чалавек. 3 іх 23 % — гэта пенсіянеры. Для параўнання — моладзі да 30 гадоў — усяго 19 %».

Мінскі метрапалітэн, у сваю чаргу, гатовы прапанаваць каля 200 вакансій: «Сярод найбольш запатрабаваных — манцёр пуці, абліцоўшчык-плітачнік, маляр. Гэтыя прафесіі часцей выбіраюць мужчыны, а жанчыны, як правіла, цікавяцца вакансіямі прыбіральшчыка памяшканняў або станцый. Мы адкрыты для суіскальнікаў любога ўзросту, у тым ліку «сярэбранага». Для нас гэта не вызначальны фактар, — падзяліўся **намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце і агульных пытаннях Дзмітрый ЮРЦЭВІЧ.** — Прапануем годную заработную плату, дагавор з добрым сацпакетам, у тым ліку для пенсіянераў».




### І ПАДТРЫМАЮЦЬ, І ПРАКАНСУЛЬТУЮЦЬ

Для зручнасці ўдзельнікаў кірмаш быў падзелены на тэматычныя секцыі па мэтавых групах. У секцыі пад назвай «Занятасць без меж!» праходзілі кансультацыі для людзей з інваліднасцю, а «Пачніце сваю справу з нашай падтрымкай!» прысвяцілі ахвотным атрымаць субсідыю на запуск уласнага бізнесу. Для тых, хто пакуль знаходзіцца ў пошуках сябе, працавалі секцыі «Прафесійная самарэалізацыя» і «Праца шукае вас!» Галоўнае — усе паслугі прадастаўляліся бясплатна: кожны жадаючы мог пагаварыць з прадстаўнікамі кампаній, задаць пытанні, удакладніць умовы працы і памер зарплаты, тым самым скарыстацца рэдкай магчымасцю напрамую даведацца аб вакансіях, абыходзячы сухія фармулёўкі на сайтах і ў аб'явах. Таксама ў рамках мерапрыемства спецыялісты Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне растлумачылі заканадаўчыя тонкасці: якая фінансавая падтрымка належыць беспрацоўным, якія правы мае пенсіянер, ці можна атрымаць субсідыю на адкрыццё ўласнага бізнесу. Удзельнікі мелі магчымасць задаць пытанні і тут жа атрымаць на іх дакладныя адказы. Нямала ўвагі аддалі і неабходным для працаўладкавання навыкам: складанню рэзюмэ, каб яно не згубілася ў электронных базах і зрабіла ўражанне на работадаўцаў, карыстанню інфармацыйным парталам дзяржаўнай службы занятасці.

Па такую кансультацыю прыйшла і **Людміла РАМАНАВА,** якая жадае знайсці працу сакратаром ці адміністратарам: «З работы сышла часова, а цяпер прыйшла шукаць новае месца. Ніколі б не падумала, што тэлефанаваць работадаўцам і прапаноўваць сваю кандыдатуру не так проста. Тое ж самае з інтэрнэт-платформамі: я ўжо сутыкалася з адмовамі тры ці чатыры разы. Думаю, прычына ва ўзросце: у рэзюмэ бачаць дату нараджэння і далей нават не чытаюць. Фатаграфію таксама ўспрымаюць з падазрэннем: маўляў, зроблена шмат гадоў таму, — падзялілася жанчына. — Цяпер мне страшна адгукацца на вакансіі ў інтэрнэце. Думаю, кірмаш у гэтым пытанні зручнейшы: можна адразу пагаварыць з людзьмі, даведацца, у чым будзе заключацца работа, якія прапаноўваюцца ўмовы».

З гэтым згодная і **Галіна ВАШКЕВІЧ,** якая прыйшла сюды ў пошуках падпрацоўкі: «Даведалася пра гэты кірмаш вакансій і вырашыла паспрабаваць. Дома сумна сядзець, асабліва цяпер, калі дні кароткія. Хочацца і сярод людзей пабываць, і крыху падзарабіць. Я 46 гадоў прапрацавала ў цырульні, потым уладкавалася гардэробшчыцай. Але гэта сезонная праца — у маі ўсё зачынілася, і зараз я зноў шукаю нешта прыдатнае».

Жаданне працаваць не мае ні тэрміну даўнасці, ні іншых абмежаванняў, сведчаннем чаго і стаў кірмаш вакансій. Яго наведвальнікі сышлі з новымі надзеямі, а работадаўцы — з разуменнем: сярод усіх слаёў насельніцтва нямала адказных і матываваных людзей, зацікаўленых у працаўладкаванні. Акрамя таго, падобныя мерапрыемствы — магчымасць грамадства не губляць вопыт і веды тых, хто хоча і можа, нягледзячы на ўзрост. І калі дзякуючы кірмашу хоць бы адзін чалавек знойдзе сваё месца, значыць, мэта дасягнута, а ініцыятыву неабходна працягваць і развіваць далей.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже земельных участков в частную собственность и права аренды земельных участков в Пуховичском районе

**Организатор электронных торгов:** Пуховичский районный исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Ленинская, 47, тел.: (801713) 35645, 35427; 8 (033) 9029538.
**Оператор электронной торговой площадки:** открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа»
**Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by. Дата проведения электронных торгов: **4 ноября 2025 г.**
**Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного участка, *га* | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, *руб.* | Задаток, *руб.* | Расходы по подготовке материалов, *руб.* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 16** | 624450100001004163, строительство и обслуживание остановочного комплекса с торговым павильоном, аренда сроком на 25 лет | 0,0126 | Сети электроснабжения, водоснабжения, электросвязи | 775,37 | 77,54 | Стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 2 | **Минская область, Пуховичский район, Новосёлковский сельсовет, д. Дайнова, ул. Полевая, 3Б** | 624484302601000308, строительство и обслуживание торгового павильона, аренда сроком на 25 лет | 0,0768 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 308,64 | 30,86 | Стоимость объявления в СМИ и ЭТП |
| 3 | **Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. 8-й Гвардейской Танковой Дивизии, 21** | 624450100001004355, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома, частная собственность | 0,1063 | Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения | 26000,00 | 2600,00 | 3126,56 + стоимость объявления в СМИ и ЭТП |

**Задаток** для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах. **Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах** с прилагаемыми к ним документами – **30 октября 2025 года до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143.

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель электронных торгов (претендент на покупку) обязан:

возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов;

возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией прав в отношении земельного участка;

внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения) за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

внести плату за право аренды земельного участка.

После совершения победителем электронных торгов (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола, а также заключает с ним договор аренды земельного участка – в случае проведения электронных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов **подлежат возмещению** в порядке, предусмотренном в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

# ВЫЙГРАЦЬ У «ГЕНЕТЫЧНАЙ ЛАТАРЭІ» І ДАЖЫЦЬ ДА 140



**Вучоныя — пра сакрэты доўгажыхарства**

Што вызначае працягласць нашага жыцця? У якой ступені мы можам кантраляваць і ўплываць на яе? Ці ўсё залежыць ад генетыкі? Якія даследаванні правялі сярод доўгажыхароў вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук? Высвятляем з дапамогай эксперта.

## ПРЫБАВІЦЬ 10-20 ГАДОЎ? МОЖНА!

Як вядома, на нашай планеце існуюць так званыя блакітныя зоны — рэгіёны з анамальна высокай колькасцю доўгажыхароў. Напрыклад, адзін з іх — востраў Сардзінія ў Італіі, дзе (пераважна ў сельскай мясцовасці) жыве вялікая колькасць людзей, якім больш за 100 гадоў. У многім гэта тлумачыцца тым, што яны шмат займаюцца цяжкай фізічнай працай, прытрымліваюцца спецыяльнай малочнай дыеты. Аднак у цэлым такіх зон у свеце некалькі — і ўсе яны адрозніваюцца кліматам, дыетай жыхароў і іх менталітэтам. Таму немагчыма адназначна адказаць на пытанне, што канкрэтна з'яўляецца вырашальным.

Сучасная навука абнадзейвае, што нашы гены сапраўды адыгрываюць важную ролю ў доўгажыхарстве, але яны вызначаюць усяго толькі каля 30 % працягласці жыцця.

— Гэта так званыя стартавыя ўмовы, з якімі мы нараджаемся. Аднак каб рэалізаваць атрыманы патэнцыял, важныя лад жыцця, фізічная актыўнасць, медыцынскія паслугі, харчаванне, сацыяльныя фактары. Калі ўсё гэта ўдала складваецца, працягласць жыцця можна павялічыць на 10-20 гадоў, — кажа **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Павел МАРОЗІК.** — Адпаведна генетыка дае нам інструкцыю, якую чалавек можа або рэалізаваць, або не — гэта вырашаць яму.

## ШТО ПАКАЗАЛА ДАСЛЕДАВАННЕ?

Інстытут генетыкі і цыталогіі НАН даследаваў беларускіх доўгажыхароў — больш за 600 пажылых людзей, сярод якіх трэць былі старэйшыя за 90 гадоў. Вывучаўся не толькі генетычны склад, але і мікрабіём кішэчніка — як вядома, гэта тая нябачная армія мікраарганізмаў, што вызначае як наш імунітэт, так і шэраг іншых функцый. Былі выяўлены свае мікрабіялагічныя асаблівасці беларускіх доўгажыхароў. У некаторых з іх дамінавала бактэрыя акерманся. Яна ўжывае бялок муцын, адпаведна, зніжае рызыку запаленчых захворванняў у кішэчніку. А запаленне, як вядома, з'яўляецца адным з асноўных рухавікоў старэння.

Акрамя таго, было даказана, што прабіётыкі і мадыфікацыя харчавання не толькі могуць падоўжыць жыццё, але і зніжаюць рызыку розных сацыяльна значных захворванняў. Былі выяўлены і канкрэтныя індывідуальныя гены і генетычныя маркеры, якія адказваюць за доўгажыхарства. Гэта генетычныя маркеры двух асноўных кірункаў: адны з іх асацыяваны са зніжэннем метабалічнай актыўнасці (як вядома, адзін са спосабаў падоўжыць жыццё лабараторных жывёл — зніzіць каларыйнасць іх рацыёну, такія ж механізмы працуюць і для чалавека), іншыя — з узмацненнем клетачнай абароны, гэта значыць, стрэсаўстойлівасці, сістэм рэпарацыі, бо ўсё гэта ўплывае на індэкс масы цела, узровень халестэрыну, абмен рэчываў.

Адзін з выяўленых генаў — ген апаліпратэіна Е (APOE). Адзін з яго варыянтаў павялічвае рызыку хваробы Альцгеймера, а другі, наадварот, абараняе ад яе. І ад гэтага набору залежыць, будзе развівацца захворванне ці не. У цэлым вучоныя выявілі каля 10 розных генаў у беларусаў, якія асацыяваны з доўгажыхарствам.

## ЯКІ МАРШРУТ ДА ЗДАРОЎЯ?

Па выніках даследавання ў інстытуце распрацаваны генетычны пашпарт доўгажыхароў. Гэта своеасаблівая інструкцыя, якая дапамагае чалавеку і яго ўрачу вызначыць індывідуальныя генетычныя рызыкі і выбраць аптымальны маршрут да здароўя. Ён уключае тры асноўныя кірункі. Першы — прафілактыка мультыфактарных захворванняў, бо ёсць шэраг генаў, якія павышаюць рызыку тых ці іншых хвароб. Другі раздзел — фармакагенетыка. Ён пра тое, як наш арганізм пераносіць лекавыя прэпараты. Аналіз генаў, што «адказваюць» за метабалізм лекаў, дазваляе выявіць устойлівасць ці адчувальнасць да прэпаратаў і правільна падабраць дазіроўку ці знізіць колькасць прэпаратаў, што прымаюцца. Трэці кірунак — нутрыгенетыка. Гэта індывідуальны падыход да харчавання, які грунтуецца на нашым ДНК. Ён паказвае, як арганізм рэагуе на тлушчы, бялкі, вугляводы, вітаміны. Карэктуючы харчаванне, можна распрацоўваць індывідуальную дыету, а гэта дазволіць пазбегнуць нават прыёму некаторых лекавых прэпаратаў.

## ШТО РАЦЬ НАВУКА?

Як адзначыў Павел Марозік, з пункту гледжання генетыкі ў найбліжэйшы час такое істотнае падаўжэнне працягласці жыцця масава наўрад ці магчыма.

— Біялагічнае абмежаванне ніхто не адмяняў, але асобныя доўгажыхары пры ўдалым спалучэнні генаў, медыцыны, ладу жыцця ўжо сёння могуць дажываць да 120 гадоў і нават больш. Аднак галоўная мэта — не ў рэкордзе. Задача генетыкі і персаналізаванай медыцыны — не проста павялічыць працягласць жыцця, а падоўжыць яе актыўным і здаровы перыяд, зрабіць так, каб чалавек і ў 80, і ў 90 гадоў заставаўся актыўны, з добрай памяццю, з магчымасцю падарожнічаць і радавацца жыццю. Адпаведна навука дае рэальны інструмент, каб гэта найбольш удала рэалізаваць, — падкрэсліў Павел Марозік.

Ён расказаў пра нядаўнюю навуковую працу іспанскіх вучоных, якія правродзілі даследаванне сваёй суайчынніцы. Жанчына памерла ў 116 гадоў без гісторыі анкалагічных і кардыялагічных хвароб. У яе былі выяўлены прыкметы вельмі сталага ўзросту: пакарочаныя целамеры, кланальнае кроваўтварэнне і інш. З іншага боку, яна валодала вельмі магутнымі абароннымі ўласцівасцямі. У яе выявілі вялікую колькасць унікальных генаў, якія амаль не сустракаюцца ў еўрапейскай папуляцыі. Акрамя таго, у жанчыны быў здаровы ліпідны профіль і амалоджаная кішэчная мікрабіёта з дамінаваннем супрацьзапаленчых бактэрый.

— Даследаванне паказала, што жанчына выйграла ў «генетычную латарэю», атрымала ўнікальны генатып і змагла яго ў далейшым рэалізаваць: дажыць да глыбокай старасці, — рэзюмаваў навуковец.

**Алена КРАВЕЦ.**


**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**ОАО «УНР КЭУ»** (УНП 100363960),
объявляет о проведении **17.10.2025 г.** в 10.00
публичных торгов по адресу:
г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501

**Перечень предметов торгов публично размещен на сайте: bankrot-torg.by.**

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 80296083100.

Продавец: ОАО «УНР КЭУ», тел. 80296953010.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; 80296083100; contact@bankrot-torg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **16.10.2025 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **04.10.2025** по 17.00 **16.10.2025** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, аукционный сбор по лотам №№ 7, 10 – 5 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по лотам №№ 11, 12 – 0,9 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %), по остальным лотам 9 % от цены реализации предмета торгов без учета НДС (НДС 20 %).

Дополнительные условия: нет.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения торгов.

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» от 20.09.2025 г.



УНП 691310944

ДОПОЛНЕНИЕ
К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ
ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,
***опубликованной в газете «Звязда» от 21.08.2025 г.,***
по объекту
«Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».
**Жилой дом № 3 по ГП**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 3 по генплану предлагаются:

**2 (две)** однокомнатные квартиры **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 440 до 5 800 белорусских рублей;**

**4 (четыре)** однокомнатные квартиры **площадью 40-44 кв. м**, стоимость 1 кв. метра **от 5 280 до 5 640 белорусских рублей;**

**1 (одна)** двухкомнатная квартира **площадью 53-54 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 184 до 5 544 белорусских рублей;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир **площадью 62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 704 до 5 096 белорусских рублей;**

**1 (одна)** двухкомнатная квартира **площадью 81-82 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 544 до 4 904 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3-7 календарных дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику: пн.-пт. с 9.00 до 19.00, сб. – с 10.00 до 16.00, вс. – выходной либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 06.10.2025 г.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
(организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Ветеревичи»** (продавец)
проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ **ЖИЛОГО ДОМА**
**с инв. № 602/С-40844**

*(составные части и принадлежности: веранда, сарай (2 шт.), сарай-пристройка (2 шт.), уборная)*
**общей площадью 70 м², расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624482004101000081 (право аренды по 27.11.2059) площадью 0,2010 га по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Шацкий с/с, д. Слобода, ул. Центральная, д. 32.**

Начальная цена – **1 958,21** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **195,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 22.03.2025.*

Аукцион состоится **04.11.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **31.10.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801713) 34-35, (8029) 125-92-15.**

УНП 600116017

НА КАНТРОЛІ

# ЖЫВЁЛЫ — ГЭТА ВАМ НЕ ЦАЦКІ!

## У краіне зменшылася колькасць бяздомных катоў і сабак



**Яны ды іншыя хатнія гадаванцы становяцца адданымі спадарожнікамі і сапраўднымі сябрамі, як толькі трапляюць у сям'ю, дзе пра іх клапоцяцца. Аддаючы сваю ласку і любоў гаспадарам, яны заслугоўваюць быць абароненымі. І, насамрэч, менавіта ад чалавека і яго адказнасці залежыць, якой будзе якасць жыцця братоў нашых меншых, ці не застануцца яны ўзімку на вуліцы, ці не змерзнуць...**

Сусветны дзень абароны жывёл, які адзначаецца 4 кастрычніка, — нагода звярнуць увагу на тых, хто асабліва мае патрэбу ў нашай дапамозе. Штогод тысячы сабак і катоў апынаюцца на вуліцы, пазбаўляюцца ежы і цяпла. Многія з іх, некалі любімыя гадаванцы, не могуць адаптавацца да жыцця без чалавека.

Гаспадары павінны адчуваць адказнасць, якую яны бяруць на сябе, калі заводзяць ката або сабаку, нагадала **старшы выкладчык кафедры ўнутраных незаразных хвароб Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Ганна СЕЛІВАШКА**. «Большасць з іх апынаюцца на вуліцы, таму што гаспадарам надакучыла новая цацка. Заводзячы жывёл для забавы, некаторыя забываюць, што пра іх трэба клапаціцца. У выніку гадаванцы, якія апынуліся на вуліцы, або гінуць, таму што не прыстасаваныя да жыцця ў такіх умовах, або папаўняюць шэрагі бяздомных жывёл».

Такія выпадкі, на жаль, нярэдкасць, таму, па словах спецыяліста, неабходна з ранніх гадоў выхоўваць у дзецях маральнае, гуманнае стаўленне да жывёл. Галоўным выхаваўчым фактарам з'яўляецца прыклад бацькоў дзіцяці і іншых дарослых. У цывілізаваным грамадстве, сярод якога мы знаходзімся, жорсткасць у адносінах да жывёл увогуле недапушчальная.

За дзесяць месяцаў у параўнанні з папярэднімі гадамі павялічылася колькасць пунктаў часовага ўтрымання жывёл. Аб гэтым расказала **намеснік начальніка ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі МЖКГ Надзея СЯЎРУК**. «Разам з тым практычна ў два разы зменшылася колькасць жывёл, якіх неабходна адлавіць, — расказала спецыяліст. — Лічбы сведчаць, што колькасць безнагляднах жывёл у краіне паступова скарачаецца».

Магчыма, прычына гэтай абнадзейлівай тэндэнцыі ў тым, што сёлета ў краіне ўступіў у сілу Закон «Аб адказным абыходжанні з жывёламі». Ён прадугледжвае адказнасць за жорсткасць і абыякавасць да братоў нашых меншых аж да крымінальнай. На некаторых гэта дзейнічае больш эфектыўна, чым заклікі да міласэрнасці і сумлення.

**Аксана ДАВЫДЗЕНКА, старшыня Асацыяцыі зоаабарончых арганізацый**, дадала, што адлоў жывёл — гэта вымушаная мера: «Мы заўсёды задаём грамадзянам адно і тое ж пытанне: чые гэта жывёлы?» Калі ласка, не выкідвайце сваіх гадаванцаў, не дапускайце іх бескантрольнага размнажэння і самавыгулу!

**Яна ВАЛАСАЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**







**Центр Промышленной Оценки**
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ
В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Ивацевичдрев», Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2. УНП 200100328 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by)** |

**Предмет электронного аукциона**

**Лот № 1. Адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 33, 33/4**

**Участок раскроя плитных и листовых материалов (Д 3-4/К-КП)** (**4 693,0 кв. м,** 500/С-31921), **тепловые сети** (500/С-13017974, 126,5 м). ***Оборудование, входящее в состав лота***: **трансформатор** (инв. № 00000316), **трансформатор силовой** (инв. № 00000320), **оборудование ТП** (инв. № 00000332)

***Обременение:*** площади здания частично сданы в аренду 1480,59 кв. м)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 8 351 280,00 бел. руб.**
(снижена на 30 %)

**Лот № 2. Адрес: г. Минск, ул. Кальварийская, 33**

**Ремонтно-механические мастерские** (**1053.0 кв. м,** 500/С-23110)

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 3 072 000,00 бел. руб.**
(снижена на 20 %)

***Сведения о земельном участке, на котором расположены лоты*** *№ 1 и № 2*: пл. **3,6834 га** предоставлен продавцу на праве постоянного долевого пользования (доля: 789/10000) для обслуживания зданий и сооружений. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0784 га) и сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0775 га). **После продажи лота Продавец уполномочивает Покупателя обратиться за определением доли (установлением сервитута при необходимости) в праве на земельный участок, необходимой для обслуживания капитальных строений в установленном законодательством порядке**

**Лот № 3.**
**Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Мопровская, д. 2а, 4, 4/2, 4/4, 4/6, 4/13, 4/14, 4/16, 4/18, 4/27, 4/31, 4/35, ул. Радюка, д. 2**

**Производственная база** в составе: **ТП** (420/С-4885, 29,0 кв. м, составные части: 5 каб. линий электропередач КЛ-10кВ), **здание ТП** (420/С-4879, 21,4 кв. м); **здание проходной** (420/С-4855, 80,3 кв. м, составные части: терраса), **админист. здание** (1439,9 кв. м, 420/С-4837, составные части: подвал, две пристройки, три навеса), **весовая** (420/С-4808, 44,7 кв. м), **здание склада ОКС** (420/С-4812, 199,9 кв. м), **здание склада готовой продукции и материалов** (420/С-4836, 1362,9 кв. м); **здание склада хранения цемента** (420/С-4835, 29,0 кв. м), **РМЦ** (420/С-4802, 404,2 кв. м), **здание метал. гаража** (420/С-4854, 20,4 кв. м), **экспортный участок** (420/С-4803, 491,2 кв. м, составные части: пристройка), **канализац. сеть** (420/С-44169, 1172,0 м), **водопров. сеть** (420/С-44170, 1811,4 м), **здание быт. помещений** (420/С-4810, 201,3 кв. м), **здание заготовит. цеха** (420/С-4811, 4012,1 кв. м, составные части: 5 пристроек); **здание лесоцеха** (420/С-4834, 225,7 кв. м, составные части: 2 навеса), **сборочно-отделочный цех** (420/С-4883, 3863,4 кв. м, составные части: 3 пристройки), **здание столяр. цеха** (420/С-4880, 393,5 кв. м), **здание цеха ширпотреба** (420/С-4853, 1713,8 кв. м, составные части: подвал, 2 холодные пристройки); **здание склада нитропродуктов** (420/С-4852, 92,2 кв. м), **котельная** (420/С-4813, 870,1 кв. м, составные части: 3 пристройки, дымовая труба, 2 участка тепловой сети, участок теплотрассы); **кап. строение** (420/С-4809, 830,3 кв. м, составные части: пристройки, терраса, ограждения 3 участка, ворота 2 единицы), **асфальт. покрытие** (13510 кв. м, инв. № 000024). ***Имущество, входящее в состав лота***: **котел водогрейный СН300 COMPACT** (инв. № 042545), **котельная установка с водог. котлом** (инв. № 000001), **электрощит** (инв. № 042342), **предтопка к котлу водог. СН300** (инв. № 042546), **оборудование ТП** (инв. № 000037), **транспортер накопителя топлива к котлу водог.** (инв. № 042548), **транспортер подачи топлива к котлу водогрейному** (инв. № 042549), **транспортер удаления золы от котла водогр.** (инв. № 042550), **шкаф управления котлом водогр.** (инв. № 042551), два **шкафа метал. (магазин)** (инв. № 000003, 000002), **насос центроб. 1К8/18** (инв. № 3318), **подогреватель ПВ 2-12** (инв. № 042590), **насос SMM100-65-200** (инв. № 3208), **пароподогреватель ПП1-32-7-IV** (инв. № 042544), **подогреватель ПВ2-12** (инв. № 042591), **установка «ЭКО-СОФТ» ДФК-0,8-ЭВ** (инв. № 042589), **насос центробежно-вихревой ЦВК-4/112** (инв. № 042532), **два насоса NB 65-200/198 A-F-A-BAQE** (инв. № 042593, 042594), **насос ТОП -S65/10 ЕМ** (инв. № 042647), **два насоса TOP-S 65/10ДМ** (инв. № 042543, 042542), **насос центробеж. UPS 32-80** (инв. № 042492), два **теплосчетчика ТЭМ 104-1 Ф100** (инв. № 042592, 042664), два **расходомера РСМ-05.03 С Ф50мм** (инв. № 042596, 042595), **система пож. сигнализации и оповещения людей о пожаре** (инв. № 042708), **охран. сигнализация** (инв. № 042569), **установка СПИ «Молния»** (инв. № 042695), **две охран. (тревож.) сигнализации Магазин «Леда»** (инв. № 042712, 042686) и «**Леда-1**» (инв. № 042685).

***Сведения о земельном участке***: пл. **5,9607 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания производ. территории.

***Обременение:*** 3 субабонента (договора электроснабжения непромышленного потребителя от 01.07.2024 № 32 по предоставлению электрической энергии). Капитальные строения являются неэффективно используемыми. На объекты с № 420/С-4852, 420/С-4853, 420/С-4880, 420/С-4883, 420/С-4834, 420/С-4813, 420/С-4810, 420/С-4811, 420/С-4809 изготовлены ведомости тех.характеристик. Регистрация права собственности покупателем будет происходить в соответствии с Указом Президента РБ от 19.09.2022 № 330 «О распоряжении имуществом»

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 2 121 725,49 бел. руб.**
(снижена на 40 %)

**Лот № 4.**
**Адрес: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Радюка, 2а**

**743/8140 доли в праве собственности на административно-бытовое здание с офисными помещениями и гостиницей** (общ. пл. 841,4 кв. м, 420/С-34125, составные части: пристройка с рампой).
***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1121 га,** предоставлен продавцу на праве долевой аренды (срок действия по 07.12.2040, доля ОАО «Ивацевичдрев»: 743/8140) для обслуживания административно-бытового здания с офисными помещениями и гостиницей

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 40 000,00 бел. руб.**
(снижена на 20 %)

**Расходы по оформлению прав на земельный участок, государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности на предмет аукциона и иных необходимых действий в соответствии с законодательством несет Покупатель**

**Лоты № 5, 6** (Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. Загородная, 2)

| № лота | Наименование | Начальная цена лота с НДС, руб. (снижена на 50 %) |
|---|---|---|
| 5 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый MAZ 437143-331, рег. № 1 KI T 2263**, 2010 г. в. | **12 960,00** |
| 6 | **Автомобиль грузовой бортовой тентовый MAZ 6303 A5-321, рег. № 1 KM T 0633**, 2008 г. в. | **26 520,00** |

Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток по лотам №№ 1-3 – 1 %, по лотам № 4-6 – 10 %,** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** лоты №№ 1-4 – Покупатель оплачивает **50 %** от цены продажи с учетом ранее внесенного задатка в течении **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи, **оставшуюся сумму** покупатель оплачивает в течении **10 (десяти) рабочих дней** с даты государственной регистрации договора купли-продажи в территориальной организации по государственной регистрации недвижимого имущества;
лоты №№ 5, 6 – в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель торгов, либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лотам №№ 1-3 – 3 %, по лоту №№ 4-6 – 8 % от итоговой цены продажи предмета аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете «Звязда»: по лотам №№ 1-4 – 19.09.2025, по лотам №№ 5, 6 – 05.09.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 16.10.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие принимаются по 15.10.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by**

# «ЗМАЛКУ МАРЫЛА ВАРВАРА: Я ПАЙДУ Ў ВЕТЭРЫНАРЫ!..»



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Што было, — было: у адным горадзе, каля дарогі (трэба разумець, праз недагляд камунальнікаў?) гадамі стаяла засохлае дрэва.**

**Міма яго цёмным вечарам прахадзіў злодзей і ледзь не памёр ад страху, бо падумаў, што гэта нехта з міліцыі.**

**Потым ішоў маладзён і таксама ледзь не памёр, праўда, ад шчасця, бо дрэва прыняў за постаць каханай...**

**Дзіця ж, настрашанае казкамі, у тым месцы проста заплакала, бо яму здалося, што каля дарогі... прывід.**

**А дрэва між тым было проста дрэвам. Гэта людзі бачылі ў ім, што хацелі — кожны сваё.**

**Вы не верыце? Тады... чытайце — чарговыя варыянты подпісаў да чарговага конкурснага здымка. Для пачатку можна зірнуць на верхні і...**

Першае, што кідаецца ў вочы (прынамсі, **спадару Матошку з Расоншчыны**):

Прыгажунь у краі многа:
*Ім —*
*што коней запыніць,*
*Што пажары патушыць,*
*Што бульдога ці гуль дога*
*К свайму сэрцу прытуліць.*

Там, яшчэ раз гляньце на здымак, зайздроснае месцейка! Грэх не падзівіцца (разам са **спадаром Камароўскім з Оршы**), грэх не зразумець відавочнага:

*Ад чаго сумуюць коні?*
*Ды ад страчаных надзей,*
*Што красуня*
*хіба, поні*
*Мо прыгорне да грудзей.*

А вось іх — дваіх — гэта наўрад ці...

Ёсць у коней і шмат іншых падстаў для смутку.

А на думку шаноўнага **Мікалая Старых з Гомеля**, працсей «зарабляць на коціках, сабачках».

Гэта — лагічная выснова, а калі ведаць расцэнкі... Ад іх і радкі:

*Забалелі ў коней ногі,*
*Коні*
*просяць дапамогі...*
*Але ветурач спачатку*
*Пачала лячыць сабачку.*
*Абяцаў ёй гаспадар*
*Куды большы ганарар.*

Ды яшчэ і зверху, можа, «накіне» — за ўвагу, за праяўленую любоў: з яе ж, і сапраўды, усё пачынаецца.

Прыклад? Ды калі ласка — ад **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска:**

*Змалку марыла Варвара:*
*Я — пайду ў ветэрынары!*
*...Ёсць дыплом!*
*І працу мае,*
*Ад якой — душа спявае:*
*Што ні дзень —*
*настрой вясёлы,*
*Бо любоў ёсць да жывёлы.*

Грошы, трэба разумець, таксама... (Анекдот адным радком: «Слепаваты ветэрынар чатыры месяцы выходжваў норкавую шапку»).

Адкуль — маеш мэту (ці мару)? Ідзі да яе! Не можаш ісці? Паўзі! Калі і гэта не можаш, — ляж і ляжы ў яе напрамку... Толькі так пераможаш!

Зрэшты, мы крыху адхіліліся: час вярнуцца да нашых... коней, якія, паводле слоў **спадара Сабалеўскага з Узды,** могуць... размаўляць, могуць дуроніка-сабачку жыццю павучыць. Даслоўна:

*Ты не радуйся, міленькі,*
*Што на ручках носяць,*
*Што завуць цябе маленькім,*
*Услужыць не просяць...*
*Вось і з намі цётка Зося*
*Гэтак жа гуляла,*
*А пасля, з тае мілосці,*
*Хутка зацугляла.*

Чытай: кось-кось — ды ў аглоблі?

Апынуўшыся там, адзін з коней дужа абураўся, крычаў: «Колькі можна ездзіць на мне?! Усё!.. Хопіць!»... Цяпер яго запрэглі ў плуг.

На здымку, паводле слоў **спадара Матошкі,** — два толькі што распрэжаныя... Адкуль і настрой:

*Сумна косю з кабыліцай...*
*Ёсць нагода засмуціцца:*
*З чалавечай «мілаты»*
*Ім — плугі і хамуты...*
*А калі б, як пса, люлялі,*
*Весялей бы выглядалі!*

Хто б спрачаўся, — **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў** — ні ў якім разе! З яго «канверта» цалкам слушнае:

*Ласка*
*ўсім, відаць, да спадобы?*
*Але ж я*
*хачу выдаць параду:*
*Гладзьце пысы*
*ў рознай худобы —*
*Да каня ж —*
*падыходзьце не ззаду,*
*Бо падкуваў*
*ён так «пацалуе», —*
*Ні адзін кастапраў не ўратуе!*

Што праўда, тое праўда (механік аўтасэрвісу думаў, што адна конская сіла — гэта вельмі мала, пакуль не падышоў ззаду), і... як ёсць, так ёсць. Паводле слоў **сужэнцаў Астроўскіх:**

*Зараз хіба ў заапарку*
*Можна ўбачыць коней у парку.*
*Мы пра іх — амаль забылі:*
*Нас імчаць — аўтамабілі.*

Адметна, што сто гадоў таму іх мелі хіба што багацеі. Тыя (на хвілінаку!), што цяпер маюць... коней. А яшчэ і птушак, змей, рыб, катоў, сабак... Прычым, на думку **спадарыні Чыгрынавай з Мінска:**

*Не жыццё — сюжэт для казкі*
*Ў шпіцаў, пудзеляў і хаскі!*
*Ды й балонкі-пекінесы*
*Нібы прынцы і прынцэсы...*
*Гора з ліхам папалам*
*Мо бяздомным дварнякам?*

Акурат як коням са здымка... Ці ўсё ж кабыліцам?

Адна з іх, кажуць, вельмі здзівілася, калі баба — з калёс, а лягчэй не стала.

Тады яшчэ раз (з падачы **спадара Камароўскага)**:

*— Праз што вы, коні, звеслі*
*Разумныя галовы?*
*— Праз тое, што не весела*
*З «парадкаў» гэтых новых:*
*На ручках у матулек*
*Даўно ўжо звыкла бачыць*
*Не дзетак у затуллі,*
*А коцікаў-сабачак.*

Пра іх жа — балючыя радкі ад **спадарыні Ісакавай з аг. Сласцёны Чавускага раёна:**

*Коні, сабачка, жанчына —*
*Мілая сэрцу карціна!*
*Пяшчота бруіцца,*
*Любоў — цераз край!*
*Ды ўсё ж дыфірамбы*
*Спяваць пачакай,*
*Бо лепей, згадзіся,*
*Было б для пачыну:*
*Убачыць дзіцяі.*
*І мужчыну з жанчынай.*

У той, што на здымку, паводле слоў **спадарыні Чыгрынавай**, імя цікавае. І не толькі:

*У Любавы — дзве забавы:*
*Конь ды Жулечка-пястушка...*
*Лепш бы к сэрцу прытуляла*
*Двух сыночкаў і дачушку.*

Мудрасць прыходзіць з узростам. Часам узрост прыходзіць адзін... (З дыялогаў: «Доктар, мне 24 гады. Мае сябры ходзяць у клубы і тусяць там да ранку... Мне вось гэта зусім не цікава... Са мной нешта не так?» — «Сапраўды, але ж не хвалюйцеся: як паказала МРТ, у вас проста маюцца мазгі»).

*А калі так, ды ў большасці, то:*
*Жывёлак песцім?*
*Маем правы:*
*Жывём не горай за людзей!*
*Любіць сабак —*
*чаму не справа?*
*Ды не забыцца б пра дзяцей!*

Вось на гэтай аптымістычнай ноце (ад сужэнцаў Астроўскіх) і завяршыцца бы чарговы конкурсны агляд. Але ж трэба падвесці вынікі.

Такім чынам, на мінулым конкурсным здымку (гл. нумар газеты за 2 жніўня альбо сайт — «Звязда», «Калейдаскоп», «Хто каго?») быў кот — кудлаты, мардаты... Акно, драбінка...

Аб тым, куды яна «вяла», найлепшыя радкі, паводле меркаванняў вялікага чытацкага журы, склалі **мінчане, сужэнцы Астроўскія, спадары Мікуліч са Стоўбцаў і Сабалеўскі з Узды, спадарыні Чыгрынава з Мінска і Лабажэвіч...**

З гэтым вось, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае.

Такім чынам, прыз у выглядзе квартальнай падпіскі на дарагую сэрцу «Звязду» накіроўваецца ў Клецк.

Хочаце, каб найстарэйшая і адзіная (са штодзённых) беларускамоўная газета пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо афармляць падпіску (сёння, дарэчы, яшчэ не позна), альбо...

Вы здагадаліся? Уважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак, прыдумаць подпіс (можна некалькі, але дасціпных, не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР.**

***P.S.*** *Шчырыя прабачэнні тым, чые радкі не прайшлі строгага адбору — на гэты раз. Затое ў наступны...*
*Пішыце!*



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.


**Информация о проведении повторных открытых аукционных торгов по продаже транспортных средств, находящихся в собственности Дочернего унитарного предприятия «Проектный институт Брестгипрозем» республиканского унитарного предприятия «Белгипрозем»**

| № лота | 1 | 2 | 3 | 4 |
| --- | --- | --- | --- | --- |
| Наименование объекта | **автомобиль легковой специальный ГАЗ 3221-244**, регистрационный номер 1783 KB-1, 2015 года выпуска, цвет – бордовый | **автобус вагон ГАЗ 3221-264**, регистрационный номер AK 7752-1, 2015 года выпуска, цвет – серый | **автомобиль легковой специальный LADA LARGUS**, регистрационный номер 7480 KB-1, 2015 года выпуска, цвет – темно-коричневый | **легковой специальный вагон UAZ 3962**, регистрационный номер 4930 EK-1, 2000 года выпуска, цвет – серый |
| Начальная цена продажи (с НДС) | **9 939,79** | **10 166,82** | **4 865,94** | **2 674,38** |
| Сумма задатка | 900,00 | 1 000,00 | 400,00 | 200,00 |

**Размер штрафа,** уплачиваемый в случаях, определенных Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 — **4 200 рублей (BYN)**

**Продавец –** Дочернее унитарное предприятие «Проектный институт Брестгипрозем» республиканского унитарного предприятия «Проектный институт Белгипрозем» г. Брест, ул. Малая, 3/1, тел.: 58-93-46, 8 (029) 720-87-98

Извещение о проведении аукционных торгов опубликовано на сайтах: www.bgcn.by, www.city.brest.by, www.brest-region.gov.by и www gki.gov.by

**Аукцион состоится 11 ноября 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607**

**Заявления на участие в аукционе принимаются с 8.30 06.10.2025 г. до 16.00 04.11.2025 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью», г. Брест, ул. Ленина, 50, тел. 53-81-92. www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № BY73AKBB30127803600111000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код банка AKBBBY2X, УНП 290433924 в срок до 16.00 04.11.2025 г.

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень


**АВЕН**. Абстаноўка гэтага тыдня напоўніць ваша жыццё прыемнымі падзеямі. Вы зможаце знайсці нетрывіяльнае рашэнне старой праблемы. Спрыяльныя абставіны дапамогуць настроіцца на пазітыў і ўпэўнена паглядзець у будучыню. Паспрабуйце знайсці і ліквідаваць або нівеліраваць прычыны, з-за якіх была парушана ваша ідылія.


**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень будзе прыемны і спакойны. Вольны час накіруйце на ўладкаванне асабістых спраў. Няма тых пытанняў, якія вы не змаглі б вырашыць на сваю карысць. Больш такту — і перамога за вамі. У сярэдзіне тыдня можа з'явіцца апатыя. Неабавязкова заўсёды быць дзейным чалавекам.


**БЛІЗНЯТЫ.** Можаце смела ўкараняць інавацыі ў жыццё. Паспрабуйце сябе ў новых справах, асвойце новае хобі, паэксперыментуйце з прычоскай або пазбаўцеся ад непатрэбных рэчаў. У фінансавых пытаннях гараскоп рэкамендуе праявіць асцярожнасць. Калі няма крайняй неабходнасці, перанясіце на наступны тыдзень буйныя пакупкі і іншыя магчымыя выдаткі.


**РАК.** У пачатку тыдня можа здацца, што вы перасталі выклікаць цікавасць у іншых людзей, але перажываць не варта. Праз некаторы час вы зноў адновіце сваю папулярнасць. У гэты перыяд можаце атрымаць адказ на важнае пытанне. Калі ён будзе не такі, на які вы разлічвалі, не хвалюйцеся — усё можна паправіць, трэба толькі прыкласці пэўныя намаганні. У другой палове тыдня на першае месца выйдзе асабістае жыццё.


**ЛЕЎ.** Вы пераканаецеся ў эфектыўнасці абранага курсу. Нават калі прыйдзецца адкарэкціраваць нейкі працэс, гэта не паўплывае на ваш поспех. Радасны настрой спрыяльна адаб'ецца на адносінах з блізкімі людзьмі. Гараскоп пакідае надзею, што хто-небудзь з іх пасадзейнічае ў вырашэнні пытанняў або здзівіць прыемным сюрпрызам. Бліжэй да выхадных будзьце ўважлівыя да свайго харчавання.


**ДЗЕВА.** Энергіі будзе хоць адбаўляй, але ёсць рызыка накіраваць яе ў няправільнае рэчышча. Часцей райцеся з тымі, хто ведае толк у жыцці. Карціна цяпер такая, што кожны з вас мае ўсе шанцы здабыць асабістае шчасце. У канцы тыдня будзе карысна звесці да мінімуму любыя кантакты. Чытанне кніг прынясе куды больш карысці.


**ШАЛІ**. Дар пераканання праявіцца надзвычай ярка. Ужывайце свае красамоўства па прызначэнні і праявіце крыху больш кемлівасці ў бягучых справах. Думайце шырэй за звыклыя шаблоны. Нават калі падасца, што адна з ідэй злёгку ўтапічная, не спяшайцеся канчаткова адмаўляцца ад яе. З сярэдзіны тыдня жыццёвыя прыярытэты трохі зменяцца.


**СКАРПІЁН.** Рэкамендуецца нацэліцца на доўгатэрміновыя перспектывы. З'явіцца некалькі неадкладных задач. Вырашаючы іх, абапірайцеся і на вопыт, і на інтуіцыю. Пазітыўны настрой і вера ў сябе дапамогуць годна правесці гэты час. Пры неабходнасці можаце разлічваць на падтрымку блізкіх людзей. Не замыкайцеся ў сабе і не спрабуйце стрымліваць эмоцыі.


**СТРАЛЕЦ.** Абставіны выклікаюць невялікую разгубленасць. Будзеце падсвядома адчуваць трывогу ад зносін з кімсьці з новых суседзяў ці сяброў. Магчыма, лепш не фарсіраваць падзеі на шляху збліжэння з гэтым чалавекам. Спяшацца не трэба і ў хатніх справах. Карціна тыдня не выключае бытавых траўм. Неабходна сачыць і за ўзроўнем жыццёвых сіл.


**КАЗЯРОГ.** Хутчэй за ўсё, вам не ўдасца пазбегнуць недамовак і плётак. Паспрабуйце не прыцягваць да сябе занадта шмат увагі, сціпласць і прастата вітаюцца літаральна ва ўсім. У цэлым жа тыдзень спрыяльны для старту новых ідэй. Да яго сярэдзіны ў многіх з вас з'явяцца на руках галоўныя козыры.


**ВАДАЛІЎ**. Пачатак тыдня адзначыцца незвычайнай прапановай. Не спяшайцеся яе адхіляць. Не выключана, што сказанае, калі не цалкам, то часткова, можна выкарыстоўваць з разлікам на будучыню. У сярэдзіне тыдня ў вас узрасце творчы патэнцыял. Не выключаецца верагоднасць нечаканасцяў у асабістых справах.


**РЫБЫ**. У вас амаль не застанецца часу на адпачынак. Кожная справа, якую будзеце пачынаць, наблізіць поспех. Асабліва прадукцыйнымі будуць перамовы і абмеркаванні. Больш настойліва змагайцеся за свае правы, дапусціўшы ў сваім голасе ноткі металу. У другой палове тыдня лепш не ўмешвацца ў падзеі, якія адбываюцца. Займіцеся сваім самаадчуваннем, знешнасцю і павышэннем энергетычнага патэнцыялу.

# ВУЧНЮ ЎДАЧА — НАСТАЎНІКУ РАДАСЦЬ

**Па гарызанталі: 1.** «Пахавайце ..., стрэлы, лукі, // Прыступайце, дзеці, да навукі». З верша Я. Коласа «За навуку». **5.** З ручайка — ..., з кніг — веды (прык.). **8.** ... у школе, што пасеў у полі (прык.). **10.** Казацкі афіцэрскі чын у царскай Расіі. **12.** Той, хто піша кнігі, складае музыку. **13.** Вечназялёнае хваёвае дрэва. **15.** Фарба для валасоў. **16.** Вокліч, які выяўляе захапленне. **19.** Вучню ... — настаўніку радасць (прык.). **20.** Навука для чалавека, што ... для жыцця (прык.). **23.** Адукацыя — ..., а труд — ключ да яго (прык.). **25.** Прывіццё ведаў, навыкаў. **27.** Талерка вагаў. **28.** Школа — самая лепшая, самая радасная ... у жыцці (прык.).

**Па вертыкалі: 1.** «Заснула лета, абудзіўшы ..., // І знік у небе жураўліны клін». З верша Д. Пятровіча «Заснула лета». **2.** Нота музычнай гамы. **3.** Не пахмурна, а ... **4.** Чарада птушак. **6.** Хто ведае ... ды букі, таму і кнігі ў рукі (прык.). **7.** «Настаўнікам быў беларускі ...». З верша Я. Купалы «Мая навука». **9.** Закончаная частка спектакля. **11.** «... знаўцы — здольнасць навучыць». Арыстоцель. **14.** Вучоба не ..., здароўе не адбірае (прык.). **17.** ... — к мудрасці прыступка (прык.). **18.** Розум не ..., у галаву не ўвальеш (прык.). **20.** Драпежная начная птушка, якая лічыцца сімвалам ведаў і мудрасці. **21.** Частка сутак. **22.** ... кніга тысячы людзей вучыць (прык.). **24.** Шлюпка. **26.** Старажытнаегіпецкі бог Сонца.



**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**Па гарызанталі: 1.** Вуды. **5.** Рака. **8.** Настаўнік. 10. Есаул. 12. Аўтар. **13.** Піхта. **15.** Хна. **16.** Ура! **19.** Удача. **20.** Сонца. **23.** Скарб. **25.** Навучанне. **27.** Шаля. **28.** Пара.
**Па вертыкалі: 1.** Восень. **2.** До. **3.** Ясна. **4.** Шнур. **6.** Аз. **7.** Абшар. **9.** Акт. **11.** Адзнака. **14.** Хвароба. **17.** Азбука. **18.** Кулеш. **20.** Сава. **21.** Ноч. **22.** Адна. **24.** Ял. **26.** Ра.

## Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК, 755 мм рт.сл. | +5..+7 °C | +8..+10 °C |
| ВІЦЕБСК, 754 мм рт.сл. | +6..+7 °C | +12..+14 °C |
| МАГІЛЁЎ, 755 мм рт.сл. | +8..+10 °C | +13..+15 °C |
| ГОМЕЛЬ, 756 мм рт.сл. | +9..+11 °C | +13..+14 °C |
| ГРОДНА, 753 мм рт.сл. | +7..+9 °C | +13..+14 °C |
| БРЭСТ, 756 мм рт.сл. | +7..+8 °C | +13..+14 °C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Першая чвэрць 30.09.–06.10. Месяц у сузор'і Вадаліва.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
- — няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
- — невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
- — слабая геамагнітная бура
- — малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

МАСКВА +12..+14 °C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +12..+14 °C



Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

## 4 КАСТРЫЧНІКА — Даты, Падзеі, Людзі

**У краіне**

**1890** год — нарадзіўся Уладзімір Мікалаевіч Бекляміцаў (г. Гродна), вучоны-заолаг, заснавальнік навуковай школы паразітолагаў і медыцынскіх энтамолагаў, акадэмік АМН СССР (1945 г.). Стварыў вучэнне аб малярыйных ландшафтах у СССР, распрацаваў практычныя мерапрыемствы па ліквідацыі малярыі ў краіне. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1944 г., 1952 г.).

**1980** год — у аўтамабільнай катастрофе загінуў першы сакратар ЦК КПБ, партыйны і дзяржаўны дзеяч, Герой Савецкага Саюза, Герой Сацыялістычнай Працы Пётр Міронавіч Машэраў.

**1990** год — на XVII з'ездзе прафсаюзаў Беларусі (4—6 кастрычніка), які аб'явіў сябе першым з'ездам ФПБ, была створана Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. З'яўляецца праваправаемніцай Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў.

**У свеце**

**1675** год — галандскі фізік Хрысціян Гюйгенс запатэнтаваў кішэнны гадзіннік.

**1895** год — нарадзіўся Рыхард Зорге, савецкі разведчык, Герой Савецкага Саюза (1964 г., пасмяротна). З 1929 г. — у разведорганах Чырвонай Арміі. У Токіа стварыў разведгрупу «Рамзай», якая здабывала важную для СССР інфармацыю. Адзін з першых паведаміў дату (20—22 чэрвеня) нападу фашысцкай Германіі на СССР. У кастрычніку 1941 г. арыштаваны японскай паліцыяй, у верасні 1943 г. прыгавораны да смерці. У 1944 г. павешаны, пахаваны ў Токіа.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы МАЛАШКУ Валерыю Анатольевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 316. Індэкс 63850. Зак. № 2197.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 кастрычніка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12